Дзяржаўная навуковая ўстанова
«Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Аб’ект аўтарскага права

УДК [39+94](476):323.315”17/19”(=161.3)

ШЫДЛОЎСКІ
Сяргей Алегавіч

# ПАМЕСНАЕ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТ.): ЭТНАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Мінск, 2023

Навуковая работа выканана ў аддзеле народазнаўства дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

**Навуковы кансультант –** **ЛАКОТКА Аляксандр Іванавіч,**
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, дырэктар ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Афіцыйныя апаненты:** **КАЛАЧОВА Ірына Іванаўна**,
доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**ДУК Дзяніс Уладзіміравіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»

**СЯМЁНАВА Людміла Мікалаеўна**,
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры сацыяльнага кіравання факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта

**Апаніруючая арганізацыя** **Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»**

Абарона адбудзецца 30 сакавіка 2023 г. у 11.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, п. 302; тэлефон вучонага сакратара: 270-29-24; E-mail: tyapkova-anna@mail.ru).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Аўтарэферат разасланы 23 лютага 2023 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат гістарычных навук Г. І. Цяпкова

# УВОДЗІНЫ

Сістэмнае гісторыка-этналагічнае вывучэнне беларускага этнасу падразумявае комплексную характарыстыку ўсіх складаючых яго груп. Аднак паместнае дваранства, якое ўяўляла сабой эканамічнае і палітычнае ядро беларускай сацыяльнай эліты канца XVIII – пачатку XX ст., доўгі час заставалася па-за фокусам увагі айчыннай этналогіі, што рабіла навуковую карціну мінулага Беларусі няпоўнай.

*Актуальнасць* тэмы дысертацыі абумоўлена тым, што даследаванне культуры паместнага дваранства вяртае беларусам важны пласт духоўнай і матэрыяльнай спадчыны, да стварэння якой беларускі народ меў непасрэднае дачыненне. Актуалізацыя цікавасці ў грамадстве да дадзенага аспекту айчыннай гісторыі мае ідавочны эканамічны эфект, ствараючы перадумовы для праектавання самабытных турыстычных прадуктаў і развіцця нацыянальных брэндаў, а таксама фарміравання арыентаванай на традыцыйныя айчынныя каштоўнасці сучаснай індустрыі вольнага часу. Вывучэнне генезісу сацыякультурных і эканамічных традыцый айчыннай эліты дазваляе праводзіць больш якасны аналіз сучасных сацыяльна-палітычных працэсаў і геапалітычных рызык, бо многія з іх з'яўляюцца праекцыяй мінулых практык вызначэння палітыка-эканамічных мэт і стратэгічных рашэнняў, у выпрацоўцы якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі паместнага дваранства Беларусі.

Храналагічныя межы даследавання абумоўлены перыядам развіцця беларускага грамадства ў складзе Расійскай імперыі і існавання на тэрыторыі Беларусі саслоўнай групы паместнага дваранства – ад канца XVIII ст. (1772 г. – першы падзел Рэчы Паспалітай) да пачатку XX ст. (12 (25) лістапада 1917 г. – дэкрэт УЦВК і СНК РСФСР «Об уничтожении сословий и гражданских чинов»). Дадзены перыяд адзначаны разгортваннем агульнаеўрапейскіх мадэрнізацыйных працэсаў, адным з вынікаў якіх было фарміраванне сучасных нацый.

Тэрыторыя Беларусі разглядаецца ў дадзенай рабоце ў межах Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, а таксама паветаў з пераважна беларускім насельніцтвам Віцебскай губерні і ўсходніх частак Віленскай і Ковенскай губерняў Расійскай імперыі.

Сістэмнасць у вывучэнні асаблівасцей развіцця паместнага дваранства як прывілеяванай часткі беларускага этнасу падразумявае выяўленне функцыянальных узаемасувязей дадзенай саслоўнай групы са знешнім асяроддзем – прыродным і сацыяльным, што магчыма рэалізаваць у межах этнаэкалагічнага і этнолага-геаграфічнага падыходаў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Работа над дысертацыяй выконвалася ў межах тэмы «Этнакультурны ландшафт Беларускага Падзвіння: рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці функцыянавання у другой палове XIX – пачатку XXI ст.» у адпаведнасці з задан-

нем 1.4.06 «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» падпраграмы № 1 «Гісторыя і культура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў (ДПНД) «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» на 2011–2015 гг., зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 09.06.2010 г. № 886 і пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 23 снежня 2010 г. № 71 «Аб зацвярджэнні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2011−2015 гг.» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 20141201 ад 11.06.2014 г.), а таксама ў межах тэмы «Развіццё нацыянальнай ідэнтычнасці этнічных супольнасцей Рэспублікі Беларусь» у адпаведнасці з заданнем 2.4 «Выяўленне самабытнага характару матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларусаў, этнічных традыцый і этнакультурнага ўзаемадзеяння культуры беларускага народу і культур іншых народаў на тэрыторыі Беларусі і ў іншых краінах у сістэме сацыягуманітарнай і эканамічнай бяспекі дзяржавы» падпраграмы № 2 «Культура і мастацтва» ДПНД «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг., зацверджанай пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 24 снежня 2020 г. № 53 «Аб зацвярджэнні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2021−2025 гг.» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 20210317 ад 23.03.2021 г.).

Тэма дысертацыі адпавядае Прыярытэтным напрамкам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2016–2020 гг. Рэспублікі Беларусь (п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы»), зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 190 ад 12.03.2015 г., Дзяржаўнай комплекснай праграме навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (падпраграма «Гісторыя і культура») і Прыярытэтным напрамкам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гг. Рэспублікі Беларусь (п. 6 «Сацыягуманітарная, эканамічная і інфармацыйная бяспека (чалавек, грамадства і дзяржава, гісторыя, культура, адукацыя і маладзёжная палітыка, спорт і турызм, кіраванне тэхналогіямі, тэхналагічнымі і сацыяльнымі працэсамі»), зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 156 ад 07.05.2020 г.

Асобныя аспекты работы былі распрацаваныя ў межах навуковых праектаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў: «Традыцыйны культурна-моўны ландшафт беларуска-рускага (Віцебска-Смаленскага) памежжа XX – пачатку XXI ст.: сімволіка фальклорных вобразаў, рытуальныя функцыі і іх камунікацыйныя рэпрэзентацыі» Г14РП-003 ад 23.05.2014 г. (2014–2016) і «Вобраз жыцця і бытавы ўклад насельніцтва беларускіх зямель: дынаміка трансфармацыі (XVI – першая палова XX ст.)» Г14Р-013 ад 23.05.2014 (2014–2016).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта дысертацыйнага даследавання – комплексная характарыстыка працэсаў і механізмаў сацыякультурнага развіцця паместнага дваранства Беларусі як прывілеяванай групы беларускага этнасу ў канцы XVIII − пачатку XX ст.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1. Акрэсліць фактары прыроднага і сацыяльна-эканамічнага асяроддзя, якія ўплывалі на фарміраванне і развіццё традыцый рассялення паместнага дваранства, а таксама матэрыяльнай культуры і побыту дваранскай сядзібы.

2. Выявіць прынцыпы заніравання прасторы дваранскай памешчыцкай сядзібы з вызначэннем наступстваў уздзеяння гаспадарчай і вітальнай актыўнасці дваран-памешчыкаў на культурны ландшафт Беларусі.

3. Прасачыць эвалюцыю традыцыйных галін аграрнай вытворчасці і практык жыццезабеспячэння дваранскай паместнай гаспадаркі Беларусі і вызначыць ступень сацыяльна-эканамічнай адаптыўнасці мясцовай сістэмы вядзення памешчыцкай гаспадаркі.

4. Прааналізаваць спецыфіку эканамічных паводзін прадстаўнікоў паместнага дваранства Беларусі і вызначыць іх каштоўнасныя дэтэрмінанты.

5. Выявіць структурныя элементы і ўнутрыгрупавую дынаміку шматсаслоўнай супольнасці памешчыцкага двара.

6. Ахарактарызаваць ролю прыроднага і сацыяльнага асяроддзя маёнтка ў працэсе выхавання маладога пакалення памешчыкаў і фарміравання гістарычнай памяці.

7. Вызначыць функцыянальнае значэнне традыцый гасціннасці ў сістэме механізмаў сацыякультурнага ўзнаўлення і кансалідацыі дваранскага памешчыцкага саслоўя Беларусі.

*Аб'ектам* дысертацыйнага даследавання з'яўляецца паместнае дваранства Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. *Прадмет* – працэсы і механізмы сацыякультурнага развіцця паместнага дваранства Беларусі як прывілеяванай групы беларускага этнасу ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў айчыннай этналогіі дынаміка сацыякультурнай адаптацыі паместнага дваранства Беларусі ва ўмовах мадэрнізацыйных змен у грамадстве канца XVIII – пачатку XX ст. разгледжана ў сістэмнай сувязі з навакольным асяроддзем: прыродным і сацыяльным; як вынік дадзенага ўзаемадзеяння вызначаны маёнтак – рэсурс матэрыяльнага жыццезабеспячэння і сацыяльнага самаўзнаўлення паместнага дваранства, месца, дзе разгортвалася асноўная гаспадарчая дзейнасць дваран-памешчыкаў, праводзілася сацыялізацыя і выхаванне маладога пакалення, прэзентавалася культура і статус дадзенай групы; вызначаны каштоўнасныя дэтэрмінанты эканамічных паводзін прадстаўнікоў паместнага дваранства Беларусі; выяўлены структурныя элементы і ўнутрыгрупавая дынаміка сацыяльнай супольнасці памешчыцкага двара; даследаваны стратэгіі мемарыялізацыі гісторыі роду і выхавання гістарычнай свядомасці ў асяроддзі памешчыцкай моладзі; ахарактарызавана кансалідуючая функцыя традыцый гасціннасці як інструмента палітычнай мабілізацыі прадстаўнікоў паместнага дваранства і спосабу падтрымання высокай унутрыгрупавой салідарнасці.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Пераважным месцам жыццядзейнасці значнай часткі прадстаўнікоў айчыннага памеснага дваранства і асноўным рэсурсам, які забяспечваў выкананне дадзенай саслоўнай групай яе сацыяльных функцый, з'яўляўся маёнтак. Размяшчэнне дваранскіх памешчыцкіх сядзіб у прасторы беларускіх ландшафтаў было вынікам узаемадзеяння прыродных і сацыяльна-эканамічных фактараў. Назіралася паступовае зніжэнне прыярытэтнасці прыродных фактараў на карысць фактарам сацыяльным. Пры выбары месца пад будаўніцтва дваранскай сядзібы і яе архітэктурна-планіровачнага рашэння землеўладальнікі найчасцей кіраваліся сацыяльнымі крытэрыямі: ацэнкамі прэстыжнасці тэрыторыі, наяўнасцю доступу да дэфіцытных рэсурсаў (матэрыяльных або сімвалічных), бяспекай, камфартабельнасцю, блізкасцю адміністрацыйных цэнтраў і чыгункі, а больш шырока – комплексам эстэтычных, сацыяльна-камунікацыйных, гаспадарча-бытавых патрабаванняў да ідэальнага памешчыцкага двара і сядзібнага побыту, якія канцэптуалізаваліся ў паняцці «выгóды». *Упершыню ў айчыннай этналогіі ахарактарызаваны аксіялагічны змест паняцця «выгоды», які ўваходзіў як каштоўнасны элемент у структуру светапогляду прадстаўнікоў памеснага дваранства Беларусі і ўяўляў сабой комплекс эстэтычных, сацыяльна-камунікацыйных, гаспадарча-бытавых патрабаванняў да ідэальнага памешчыцкага двара і сядзібнага побыту.*

2. У працэсе гістарычнага развіцця памешчыцкага маёнтка і ўздзеяння гаспадарчай і вітальнай дзейнасці яго насельнікаў на прыроднае асяроддзе быў сфарміраваны адзін з традыцыйных тыпаў культурнага ландшафту Беларусі: сядзібны ландшафт. Маёнтак забяспечваў рэалізацыю матэрыяльна-вытворчай, гаспадарча-бытавой, сацыялізацыйна-выхаваўчай, рэкрэацыйнай і статусна-рэпрэзентатыўнай функцый у сістэме жыццезабеспячэння і сацыякультурнага ўзнаўлення дваранскай сям'і. У адпаведнасці з патрэбай забеспячэння вышэйназваных функцый на тэрыторыі дваранскай сядзібы фарміраваліся наступныя зоны: вытворчая, гаспадарчая, жылая, рэкрэацыйная і парадная. Іх суадносіны ў агульнай прасторы маёнтка залежалі ад фінансавых магчымасцей памешчыка і тыпу структурна-функцыянальнага заніравання сядзібы. Можна вызначыць два тыпы заніравання, кожны з якіх уключаў пераходныя падтыпы. *Тып «рэзідэнцыя»* характарызаваўся дамінаваннем статусна-рэпрэзентатыўнай функцыі з развітымі парадней і рэкрэацыйнай зонамі, *тып «фальварак»* – матэрыяльна-вытворчай спецыялізацыяй тэрыторыі з абавязковай наяўнасцю вытворчай зоны. Пры ўсіх адзначаных адрозненнях абодва тыпы ў роўнай ступені эфектыўна забяспечвалі рэалізацыю гаспадарча-бытавой і экзістэнцыйнай функцый памешчыцкай сям'і. *Упершыню ў айчыннай этналогіі вызначаны функцыі маёнтка ў сістэме жыццезабеспячэння і сацыякультурнага ўзнаўлення дваранскай сям'і і прапанавана тыпалогія структурна-функцыянальнага заніравання тэрыторыі дваранскай памешчыцкай сядзібы Беларусі.*

3. Гістарычна дваранскі маёнтак фарміраваўся ва ўмовах дамінавання экстэнсіўных форм гаспадарання з улікам задачы забеспячэння максімальнай рэсурснай самадастатковасці. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі заставалася вядучай галіной эканамічнай дзейнасці памеснага дваранства. Асаблівасці сістэмы вядзення на беларускіх землях аграрнай памешчыцкай гаспадаркі былі закладзены ў часы існавання Рэчы Паспалітай і захаваліся ў сваіх асноўных рысах на землях Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Сучаснікамі дадзеная сістэма апазнавалася пад назвамі «польскі маёнтак» або «польскае землеўладанне». Вобласць выкарыстання тэрміна «польскі маёнтак» не абмяжоўвалася абазначэннем зямельна-маёмасных адносін або гаспадарчых практык дваран-католікаў, хаця апошнія ўтваралі ядро дадзенай сістэмы ў сілу таго, што ў агульным складзе мясцовых памешчыкаў рыма-католікі з'яўляліся большасцю. Да сферы функцыянавання «польскага маёнтка» ў краі адносіліся таксама землі значнай часткі праваслаўных памешчыкаў, у тым ліку дваран з велікарускіх губерняў, якія карысталіся паслугамі афіцыялістаў з тутэйшай шляхты і пасрэднікаў-«фактараў» і такім чынам траплялі ў абсяг мясцовых гаспадарчых традыцый. Такім чынам, сістэма вядзення на беларускіх землях памешчыцкай гаспадаркі валодала высокай ступенню ўстойлівасці ў адносінах да агульнарасійскіх аграрных традыцый і захоўвала свае гістарычныя рысы: распаўсюджанасць трохпольнай сістэмы севазвароту, выкарыстанне пры апрацоўцы панскіх палеткаў сялянскага інвентару, шырокае распаўсюджанне ў дарэформеннай Беларусі пазаэканамічнага прымусу, значная роля вінакурэння ў эканоміцы памешчыцкага двара, высокае значэнне пасрэднікаў у гаспадарчых камунікацыях. Кансерватызм зніжаў адаптыўнасць мясцовай памешчыцкай гаспадаркі да працэсаў мадэрнізацыі. *Упершыню ў айчыннай этналогіі ахарактарызавана традыцыйная сістэма вядзення на беларускіх землях аграрнай памешчыцкай гаспадаркі, і дадзена вызначэнне паняццю «польскі маёнтак» у дачыненні этнакультурных рэалій Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.*

4. Памеснае дваранства, у першую чаргу буйныя землеўладальнікі, з'яўлялася галоўным праваднікам знешніх уплываў і ініцыятарам інавацый, якія трансфармавалі традыцыйныя формы матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры этнасу. Ва ўмовах адаптацыі грамадства і непасрэдна самой дваранскай памешчыцкай групы да працэсаў мадэрнізацыі аб'ектыўна запатрабаванымі з'яўляліся наступныя сацыякультурныя функцыі сацыяльнай эліты: інавацыйная, кіруючая, кансалідуючая. Пералічаныя функцыі пераважна рэалізаваліся ў эканамічнай дзейнасці. Для прадстаўнікоў памеснага дваранства Беларусі эканамічная дзейнасць з'ўлялася не толькі сродкам задавальнення матэрыяльных патрэб, але і спосабам самарэалізацыі – выяўлення ўласных ведаў, уменняў, здольнасцей; формай дэманстрацыі палітычных, філасофскіх, эстэтычных прынцыпаў, а таксама спробай стварэння ідэальнай мадэлі быцця. Пры агульным росце эканамічнай культуры і рацыяналізацыі эканамічных паводзін дваранства на працягу

канца XVIII – пачатку XX ст., гаспадарчая дзейнасць памешчыкаў была абумоўлена не толькі рацыянальнымі эканамічнымі разлікамі, але і саслоўнымі стэрэатыпамі, уяўленнямі сацыяльнага прэстыжу, каштоўнаснымі дэтэрмінантамі. У гаспадарчых стратэгіях дваран-памешчыкаў эканамічная эфектыўнасць не з'яўлялася таму адзіным крытэрыем мэтапакладання. Дэманстратыўнае спажыванне, якое часта пераасэнсоўвалася ў тэрмінах «марнатраўства» і «мантачання», з'яўлялася часткай стратэгій захавання дамінуючага становішча памешчыкаў-арыстакратаў у грамадстве. Выдаткі на рэпрэзентацыю дваранскай культурнай і палітычнай прысутнасці ў краі клалася цяжарам на плечы беларускага сялянства. Рацыянальныя падыходы, як правіла, не распаўсюджваліся на вобласць працоўных адносін. Павышаная інтэнсіўнасць эксплуатацыі сялянства тлумачыцца нізкай ступенню этнічнай і канфесійнай салідарнасці ў міжсаслоўных камунікацыях у беларускай вёсцы. *Разгледжаны каштоўнасныя дэтэрмінанты эканамічных паводзін паместнага дваранства Беларусі ўпершыню ў айчыннай этналагічнай навуцы.*

5. Супольнасць панскага двара мела выразную іерархічную структуру, на вяршыні якой знаходзіўся гаспадар маёнтка і прадстаўнікі яго сям'і. Крытэрыямі стратыфікацыі на памешчыцкім двары былі саслоўнае паходжанне, маёмаснае становішча, узроставы і адукацыйны цэнз, прафесійная прыналежнасць. Разам з тым у памешчыцкім асяродку Беларусі падтрымлівалася ідэалагема «шляхецкай роўнасці» і правілы «братэрскай» (унутрысаслоўнай) узаемадапамогі. «Таварыская» мадэль паводзін была разлічаная на прадстаўнікоў роднаснага сацыяльна-культурнага асяродка і ўтрымлівала рысы ўнутрыгрупавога альтруізму. *Апісана «таварыская» мадэль паводзін прадстаўнікоў дваранскага памешчыцкага асяроддзя Беларусі і выяўлены структурныя элементы і ўнутрыгрупавая дынаміка шматсаслоўнай супольнасці памешчыцкага двара ўпершыню ў беларускай этналагічнай навуцы.*

6. Маёнтак усведамляўся дваранамі як «маленькая радзіма»: тут праходзіла значная частка жыцця памешчыка і членаў яго сям'і. Сам тэрмін «паместнае дваранства» ўказвае на значнасць дадзенага асяродкавага фактару для знешняй ідэнтыфікацыі і ўнутранага самавызначэння дадзенай саслоўнай групы. У маёнтках фарміравалася выхаваўчае асяроддзе, у якім маладое пакаленне дваран набывала першыя веды пра край і род, а таксама складваўся комплекс стратэгій мемарыялізацыі радавой гісторыі. Разам з тым заснаваная на дакументальных крыніцах гісторыя сям'і часта адсутнічала, і радавая памяць насіла дыскрэтны міфічны характар. Асаблівасцю сямейнага выхавання і хатняй адукацыі ва ўмовах дваранскага маёнтка з'яўляўся ўдзел у выхаваўчым працэсе шырокага кола асоб, якія належалі да розных сацыяльных груп. Захоўвалася магчымасць уплыву элементаў народнай педагагічнай традыцыі на выхаванне дзяцей памешчыкаў. У сваю чаргу, землеўладальнікі выконвалі педагагічныя функцыі ў дачыненні як да ўласных дзяцей, так і да ўсяго насельніцтва маёнтка, што было абумоўлена

самім характарам патрыярхальных адносін. Было сфарміравана сацыялізуючае асяроддзе маёнтка, у якім адбываўся працэс узнаўлення не толькі культуры дваранскага памешчыцкага саслоўя, але і яго іншасаслоўнага сацыяльнага атачэння. *Упершыню ў айчыннай этналагічнай навуцы ахарактарызоавана прыродна-сацыяльная прастора маёнтка як асяроддзе сацыялізацыі і ў яго полі вызначаны стратэгіі мемарыялізацыі радавой гісторыі паместнага дваранства Беларусі.*

7. Традыцыі гасціннасці і, у прыватнасці, застольны рытуал у культуры паместнага дваранства служылі спосабам прэзентацыі сацыяльнага статусу (заможнасці, сувязей, радавітасці), а таксама падтрыманню ўнутрыгрупавой статусна-ролевай дыферэнцыяцыі. Адначасова гэта быў інструмент палітычнай мабілізацыі прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя і спосаб падтрымання высокай саслоўнай салідарнасці. Гасціннасць служыла мэтам фарміравання грамадскай думкі і з’яўлялася інструментам рэалізацыі матрыманіяльных стратэгій. Пералічаныя стратэгіі прадугледжвалі пэўны тып сацыяльных камунікацый, які вымагаў ад прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя выканання ролі «таварыскага чалавека». Падобная камунікатыўная работа ператварала мясцовых дваран-землеўладальнікаў у найбольш кансалідаваную сацыяльную групу ў гетэрагенным па канфесійным і этнічным складзе грамадстве. *Вызначаны функцыі традыцый гасціннасці ў механізме сацыякультурнага ўзнаўлення саслоўнай групы паместнага дваранства Беларусі ўпершыню ў айчыннай этналагічнай навуцы.*

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніку дысертацыі**

Упершыню ў айчыннай этналогіі паместнае дваранства Беларусі даследуецца як частка сацыякультурнай сістэмы беларускага этнасу ў дынаміцы ўзаемаўплываў дадзенай прывілеяванай групы са знешнім асяроддзем – прыродным і сацыяльным. Даследаванне змяшчае вынікі, атрыманыя на падставе этналагічнага аналізу матэрыялаў архіўных і апублікаваных крыніц, прац беларускіх і замежных аўтараў. У навуковы ўжытак айчыннай этналогіі ўведзены шэраг новых мемуарных і архіўных крыніц, некаторыя з іх былі саіскальнікам апублікаваны.

Дысертацыя і 51 апублікаваная праца выконваліся аўтарам самастойна, 1 раздзел у калектыўнай манаграфіі і 1 артыкул напісаны ў сааўтарстве.

Да новых, упершыню атрыманых, вынікаў у даследаванні адносяцца наступныя:

– вызначаны аксіялагічны змест паняцця «*выго́ды*», у якім канцэптуалізуецца комплекс эстэтычных, сацыяльна-камунікацыйных, гаспадарча-бытавых патрабаванняў прадстаўнікоў дваранскага памешчыцкага асяроддзя да ідэальнага памешчыцкага двара і сядзібнага побыту;

– ахарактарызавана структура і прынцыпы сацыяльнай стратыфікацыі соцыуму дваранскага памешчыцкага двара;

– прастора памешчыцкага маёнтка інтэрпрэтавана як сфера сацыаялізацыі, а таксама сістэма захавання і трансляцыі гістарычнай памяці;

– апісаны спосабы ўмацавання ўнутрысаслоўнай кансалідацыі памеснага дваранства і фарміравання «*таварыскага грамадства*» як механізма сацыякультурнага ўзнаўлення дадзенай групы.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя тэарэтычныя палажэнні дысертацыі і вынікі даследавання прайшлі апрабацыю ў рамках 32 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых кангрэсаў, канферэнцый і семінараў: Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гендар і праблемы камунікатыўных паводзін» (Полацк, 2010, 2013, 2016); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (Полацк, 2011, 2014, 2016, 2018, 2020); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы ў вывучэнні і выкладанні грамадска-гуманітарных навук (дысцыплін)» (Віцебск, 2012); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Айчынная вайна 1812 года ў гістарычным лёсе і культурнай спадчыне народаў Расіі і Еўропы» (Віцебск, 2012); IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Псіхасацыяльная адаптацыя ў грамадстве, якое трансфармуецца: сацыялізацыя суб’екта на розных этапах антагенезу» (Мінск, 2015); XXIV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Кіраванне ў сацыяльных і эканамічных сістэмах» (Мінск, 2015); на XII Кангрэсе этнографаў і антраполагаў Расіі (Екацярынбург, Расійская Федэрацыя, 2015); V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Асоба ў прасторы і часе» (Смаленск, Расійская Федэрацыя, 2015); Рэспубліканскім навукова-практычным семінары «Актуальныя праблемы архітэктуры Беларускага Падзвіння і сумежных рэгіёнаў» (Полацк, 2015); на Першым міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры (Мінск, 2016); VII міжнароднай канферэнцыі па кагнітыўнай навуцы (Светлагорск, Расійская Федэрацыя, 2016); XII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Сацыяльна-псіхалагічныя праблемы ментальнасці/менталітэту» (Смаленск, Расійская Федэрацыя, 2016); IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю Краязнаўчага музея Полацка (Полацк, 2016); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мікрагісторыя і гісторыя штодзённасці: новы погляд на гістарычную і культурную спадчыну» (Браслаў, 2017); Рэспубліканскім навукова-практычным семінары «Праблемы і перспектывы развіцця фізічнай культуры, спорту і турызму ў Рэспубліцы Беларусь» (Полацк, 2017); VII міжнароднай міждысцыплінарнай канферэнцыі «Кагнітыўныя штудыі: кагнітыўная парадыгма ў міждысцыплінарных даследаваннях» (Мінск, 2017); II Міжнароднай навуковай канферэнцыі «"Доўгіае XIX стагоддзе" ў гісторыі Беларусі і Усходняй Еўропы» (Мінск, 2018); IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Сіверанскія сацыяльна-псіхалагічныя чытанні» (Чарнігаў, Украіна, 2018); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Бібліятэка : сувязь часоў і вектары развіцця» (Наваполацк, 2018); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі : грамадства, дзяржава, асоба» (Гродна, 2019); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Жыццё і творчая спадчына

А. С. Дамбавецкага (да 180-годдзя з дня нараджэння)» (Магілёў, 2019); IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Капыцінскія чытанні» (Магілёў, 2020); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю са дня нараджэння Васіля Кірылавіча Бандарчыка (Слуцк, 2020); XV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Раманаўскія чытанні» (Магілёў, 2020); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Новыя камунікатыўныя тэхналогіі і сучаснае беларускае грамадства» (Полацк, 2021); XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, 2021); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Л. С. Выгоцкі і сучасная культурна-гістарычная псіхалогія: праблемы развіцця асобы ў зменлівым свеце» (Гомель, 2021).

**Апублікаванасць вынікаў**

Матэрыялы даследавання адлюстраваны ў 53 публікацыях аўтара, сярод іх 2 аўтарскія манаграфіі (26,05 аўт. л.), 1 публікацыя ў калектыўнай манаграфіі (2,31 аўт. л.), 1 вучэбны дапаможнік (9,08 аўт. л.); 30 артыкулаў у рэспубліканскіх і міжнародных навуковых часопісах (17,34 аўт. л.), з іх 12 – у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (4,98 аўт. л.), 18 – у зборніках навуковых прац і матэрыялаў (12,36 аўт. л.); 19 тэзісаў дакладаў (2,49 аўт. л.) апублікаваны ў зборніках матэрыялаў канферэнцый. Агульная колькасць апублікаваных матэрыялаў складае 57,27 аўт. л.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (528 пазіцый), 2 дадаткаў. Парадак выкладання матэрыялу падпарадкаваны мэце і задачам даследавання. Асноўны навуковы тэкст займае 224 старонкі, з бібліяграфічным спісам і дадаткамі – 277 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца неабходнасць комплекснага вывучэння асаблівасцей развіцця памеснага дваранства Беларусі як прывілеяванай групы беларускага этнасу ў канцы XVIII − пачатку XX ст., вызначаецца навуковая навізна, актуальнасць работы, метадалогія і храналагічныя межы даследавання.

Першая глава **«Памеснае дваранства Беларусі як праблема этналагічнага даследавання»** ўключае гістарыяграфічны аналіз па тэме дысертацыі, апісанне асноўных груп крыніц і характарыстыку тэарэтыка-метадалагічнай базы даследавання.

Раздзел 1.1 **«Аналітычны агляд літаратуры»** прысвечаны гісторыі вывучэння памеснага дваранства Беларусі ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Вызначаецца ступень распрацаванасці даследуемай праблемы ў навуковай літаратуры.

У вывучэнні асобных аспектаў гістарычнага развіцця памеснага дваранства Беларусі ў працах беларускіх этнолагаў і гісторыкаў можна ўмоўна вылучыць паводле інстытуцыйнай прыналежнасці даследчыкаў і пануючых метадалагічных падыходаў тры этапы: 1917 г. – 1940-я гг.; 1950-я – 1980-я гг. і сучасны перыяд (1990-я – 2000-я гг.).

У першыя паслярэвалюцыйныя гады ўвага беларускіх даследчыкаў была скіравана на пытанні эканамічнай і палітычнай гісторыі, якая вывучалася ў ракурсе міжкласавай барацьбы. Аналізаваліся таксама сюжэты, звязаныя з міжканфесійнымі і этнакультурнымі канфліктамі, якія разглядаліся з пазіцыі нацыянальна-вызваленчага змагання (М. В. Доўнар-Запольскі, У. М. Ігнатоўскі, У. І. Пічэта, Ф. Ф. Турук, А. І. Цвікевіч). У гэтай сувязі этнакультурныя працэсы на землях Беларусі ў беларускай савецкай гістарыяграфіі часта рэдукаваліся да аспектаў русіфікацыі і паланізацыі беларускай сацыяльнай эліты. У 30-я гг. XX ст. працягвалі развівацца даследаванні сацыяльна-эканамічных працэсаў у беларускім грамадстве (К. І. Кернажыцкі, Д. А. Дудкоў).

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі XX ст. у беларускай савецкай гістарычнай навуцы панавала схема, якая апісвала сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў беларускай вёсцы ў парадыгме супрацьпастаўлення памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарчых інтарэсаў (А. І. Кажушкоў, І. І. Саладкоў, М. Б. Фрыдман, К. І. Шабуня). Асобнае месца ў айчыннай гістарыяграфіі дадзенага перыяду належыць М. М. Улашчыку, працы якога вызначаліся большай ступенню свабоды ад склаўшыхся ў мясцовай навуковай карпарацыі ідэалагічных схем. У 70-я – 80-я гг. XX ст. найбольшы плён быў дасягнуты ў галіне даследавання сацыяльна-эканамічных працэсаў (Х. Ю. Бейлькін, М. Ф. Болбас, П. Р. Казлоўскі, Л. П. Ліпінскі, А. М. Люты, В. І. Мялешка, В. П. Панюціч, М. М. Улашчык, В. У. Чапко). Дасягненні дадзенага перыяду ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі знайшлі сваё абагульненне ў калектыўнай манаграфіі «Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён» (1 т., 1997; 2 т., 2002).

Этапны характар у савецкай беларускай этнаграфіі пасляваеннага перыяду ў вывучэнні матэрыяльнай культуры беларусаў маюць работы Л. А. Малчанавай «Материальная культура белорусов» (1968) і «Очерки материальной культуры белорусов XVI – XVIII вв.» (1981). Важная роля ў распрацоўцы метадалогіі даследавання культуры элітарных груп беларускага соцыуму належыць А. І. Мальдзісу («Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя [...]» (1982)). Шэраг новых для айчыннай этналогіі галін даследавання, звязаных з этнічнай гісторыяй беларусаў, культурай прывілеяванага саслоўя, саслоўнай ідэалогіяй у работах дадзенага перыяду вызначыў І. У. Чаквін.

У 90-х − пачатку 2000-х гг. XX ст. з’явіліся даследаванні па розных аспектах гісторыі дваранства С. Я. Куль-Сяльверставай, С. Л. Лугаўцовай, А. М. Лютага, Г. М. Туміловіч, А. П. Жытко. Значным укладам у развіццё беларускай гістарычнай навукі сталі даследаванні пачатку XXI ст. А. Г. Каханоў-

скага, В. С. Макарэвіча, В. Л. Насевіча, С. М. Токця. Падсумаваннем даследаванняў апошніх двух дзесяцігоддзяў у беларускай гістарыяграфіі стала калектыўная манаграфія «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII − пачатак XX ст.)» (2020). Духоўная і сацыяльная культура элітных груп Беларусі вывучаецца сучаснымі беларускімі этнолагамі В. Ф. Бацяевым, В. М. Бялявінай, С. У. Грунтовым, А. В. Гурко, А. Ул. Гурко, Г. І. Каспяровіч, Л. В. Ракавай. Традыцыям харчавання беларусаў у XIX–XX ст. прысвечаны даследаванні Т. А. Навагродскага, гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – Я. М. Сахуты, архітэктурнай спадчыне – А. М. Кулагіна, Б. А. Лазукі, У. А. Чантурыя, А. Т. Федарука. Шматбаковы аналіз традыцый беларускага дойлідства праведзены ў шэрагу даследаванняў 90-х – 2000-х гг. А. І. Лакоткі. Першымі сістэмнымі этналагічнымі даследаваннямі культуры сацыяльных эліт Беларусі сталі работы А. А. Кілбас, А. Р. Раюка і С. А. Шыдлоўскага.

У цэлым у айчыннай гістарыяграфіі пры наяўнасці бясспрэчных здабыткаў захоўваецца дысбаланс, сфарміраваны на працягу XX ст., калі ў першую чаргу ў фокусе ўвагі даследчыкаў знаходзіліся сацыяльна-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя сюжэты мінулага Беларусі за кошт вывучанасці іншых аспектаў айчыннай гісторыі. Характэрнай рысай абагульняючых работ замежных даследчыкаў па гісторыі элітных сацыяльных груп на тэрыторыі былой Расійскай імперыі і Рэчы Паспалітай (рускіх даследчыкаў І. Ф. Бэлзы, М. Д. Далбілава, А. А. Камзолава, М. В. Лескінен, І. І. Свірыды, Л. І. Тананаевай, польскіх вучоных М. Асоўскай, М. Багуцкай, Р. Вапінскага, А. Кемпінскага, З. Куховіча, Я. Тазбіра) з'яўляецца недастаткова поўны ўлік беларускага матэрыялу.

З улікам адзначаных недахопаў у дадзенай дысертацыі вырашаліся задачы комплекснага аналізу сацыякультурнага развіцця памеснага дваранства Беларусі ў кантэксце беларускіх этнічных працэсаў, што вымагала ўвагі да выяўлення ўзаемасувязей і ўзаемаўплываў паміж элементамі культуры памеснага дваранства і беларускім сацыяльна-прыродным асяроддзем.

У раздзеле 1.2 **«Агляд крыніц»** характарызуюцца крыніцы, якія выкарыстоўваліся пры выкананні даследавання. *Публічна-прававыя акты* дазваляюць вызначыць саслоўную стратыфікацыю грамадства, прававы статус дваран-памешчыкаў, дынаміку ўзаемаадносін мясцовага дваранства і дзяржаўнай адміністрацыі. Найбольш поўным зборам заканадаўчых актаў Расійскай імперыі з'яўляецца «Полное собрание законов Российской империи» (ПСЗРИ). Асноўным відам *прыватна-прававых актаў*, што выкарыстоўваліся ў дадзеным даследаванні, з'яўляюцца інвентары. *Ваенна-адміністрацыйнае справаводства* шырока прадстаўлена ў зборніках дакументаў «Белоруссия в эпоху феодализма», «Белоруссия в эпоху капитализма», «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі». *Статыстычныя крыніцы* змяшчаюць масавыя даныя. Супастаўленне колькаснай інфармацыі ў межах статыстычных даследаванняў дазваляе выяўляць заканамернасці гістарычнага працэсу. Адным з першых айчынных статыстычных рэгіянальных аглядаў з'яўлялася работа «Statystyka gubernii Litewsko-

Grodzieńskiej» (1817) І. Э. Ляхніцкага. У 40-х гг. XIX ст. быў заснаваны статыстычны камітэт Барысаўскага павета, вынікам дзейнасці якога стала работа Я. Тышкевіча «Opisanie powiatu borysowskiego [...]» (1847). На працягу 1882–1884 гг. Магілёўскім губернскім статыстычным камітэтам па ініцыятыве магілёўскага губернатара А. С. Дамбавецкага было падрыхтавана і здзейснена выданне трохтомнай работы «Опыт описания Могилевской губернии [...]». У 1907 г. Магілёўскім губернскім статыстычным камітэтам была выдадзена работа К. Ц. Анікіевіча «Сенненский уезд Могилевской губернии [...]».

У *этнаграфічных работах* ствараецца, як правіла, статычны вобраз грамадства. Аднак апора даследчыкаў-этнографаў на вопыт лакальных супольнасцей і нават асобных людзей дазваляе атрымліваць больш дэтальную інфармацыю аб мінулым, што карысна, напрыклад, пры класіфікацыі розных аб’ектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Работы Л. Галамбёўскага («Domy i dwory [...]» (1830), «Gry i zabawy [...]» (1831), «Ubiory w Polsce [...]» (1830)) уяўляюць сабой этнаграфічнае апісанне матэрыяльнай культуры і традыцый розных саслоўяў на землях былой Рэчы Паспалітай – ад старажытнасці да XIX ст. Падрабязныя звесткі аб матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя на землях колішняй Рэчы Паспалітай прадстаўлены ў работах З. Глогера «Encyklopedja staropolska» (т. 1–4, 1900–1903) і «Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce» (т. 1–2, 1907–1909). У XIX – пачатку XX ст. выходзілі комплексныя апісанні асобных тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак Беларусі. Яны спалучаюць рысы як этнаграфічных апісанняў, так і статыстычных даследаванняў.

*Травелогі* (падарожныя нататкі) адлюстроўваюць уражанні вандроўнікаў аб убачаных мясцінах і людзях, паказваюць лакальныя адрозненні іх побыту і звычаяў (В. М. Севяргін, К. Контрым, Ул. Сыракомля, Ю. І. Крашэўскі, К. Тышкевіч, П. М. Шпілеўскі, А. К. Башняк, М. П. Жданаў, Б. Б. Кампенгаўзен, Р. Я. Кнюпфер, Ф. Пашкевіч, К. К. Случэўскі, С. Чэрскі, Б. А. Цялінскі, М. А. Янчук).

*Мемуарныя і эпісталярныя крыніцы*, якія ствараліся пераважна прадстаўнікамі дваранства, утрымліваюць не толькі каштоўную інфармацыю аб асаблівасцях побыту прывілеяванага саслоўя, але таксама змяшчаюць змястоўныя характарыстыкі агульнага сацыяльна-эканамічнага і культурнага кантэксту эпохі. Асаблівасцю дакументаў асабістага паходжання ў Беларусі з’яўляецца іх шматмоўны характар. Мемуары Э. Ажэшкі, Я. Булгака, Г. Жавускага, Л. Галамбёўскага, Ф. Карпінскага, Т. Корзана, П. Мядзёлкі, Ю. Нямцэвіча, Е. Фелінскай можна разглядаць як крыніцу для вывучэння этнаграфіі дзяцінства. Аўтабіяграфічная проза А. Адынца, Я. Д. Ахоцкага, Ф. В. Булгарына, С. Мараўскага, Э. Масальскага, Л. Патоцкага, Г. Пузыні, Ю. Франка ствараюць шырокую панараму «таварыскага жыцця» дваранства краю, і з’яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі быту, духоўнай і сацыяльнай культуры. Н. І. Галіцына, І. Клюкоўскі, М. Маркс, А. М. Масолаў, М. М. Мураўёў, М. Я. Нікіфароўскі, М. Палявы,

Г. Патоцкая не закранаюць непасрэдна тэматыку памешчыцкага быту або традыцый гаспадарання, аднак даюць карысныя характарыстыкі асаблівасцей узаемадзеяння розных канфесійных і этнічных груп беларускага грамадства. Асобна вылучаюцца ўспаміны Э. Вайніловіча, Г. Герыч, І. Дамейкі, А. Кеневіча, І. А. Корвіна-Мілеўскага – яны, як і дзённікі М. Брэнштэйна і М. Галубовіча, адлюстроўваюць грамадска-палітычны кантэкст эпохі.

*Публіцыстычныя тэксты* дазваляюць атрымаць інфармацыю па асобных аспектах грамадска-палітычнага, культурнага і эканамічнага жыцця памеснага дваранства. Багатую публіцыстычную спадчыну пакінулі Э. Ажэшка, А. Ельскі, У. Сыракомля. Тэксты мастацкай, у прыватнасці, *бытаапісальнай літаратуры* (творы Э. Ажэшкі, С. Акрэйца, Я. Баршчэўскага, Я. Брайцава, К. Буйніцкага, Ф. Булгарына, М. Ваньковіча, Г. Жавускага, А. Зеланд-Дубельта, У. Крастоўскага, Ю. Крашэўскага, Н. Ланской, С. Мараўскага, Э. Масальскага, А. Міцкевіча, А. Плуга, В. фон Роткірха, В. Сулімы-Савіча-Заблоцкага, С. Сыракомлі, Ю. Сянкоўскага, І. Ходзькі, Ф. Чарнышэвіча, П. Янкоўскага), утрымліваюць інфармацыю пра побыт памешчыкаў і раскрываюць унутраныя сувязі паміж разнастайнымі элементамі дваранскай культуры.

Каштоўнай крыніцай інфармацыі з’яўляецца *даведачная эканамічная літаратура* (гаспадарчыя даведнікі, параднікі і падручнікі, агранамічныя календары). На беларускіх землях існавала даўняя традыцыя выдання даведачнай літаратуры, якая зазнала ўплывы антычнай, італьянскай, нямецкай навуковай думкі. У мясцовым памешчыцкім асяроддзі шырокае распаўсюджанне мелі сельскагаспадарчыя даведнікі Ю. Струміла «Ogrody północne […]» (1820) і «Rocznik ogrodniczy powszechny […]» (1830). Парады для памешчыц утрымліваў гаспадарчы даведнік Г. Цюндзявіцкай «Gospodyni litewska […]» (1848). Кніга Г. Цюндзявіцкай вытрымала адзінаццаць перавыданняў на польскай мове. З трэцяга выдання (1856) даведнік выходзіў у дапрацаванай рэдакцыі В. Завадскай. Рускамоўны пераклад быў зроблены з восьмага польскага выдання і выйшаў у 1884 г. Аўтарству Г. Цюндзявіцкай належыць таксама «Rocznik gospodarski […]» (1854).

Выкарыстанне *іконаграфічных крыніц* у этналагічным даследаванні носіць дапаможны характар. Відарысы дваранскіх сядзіб адлюстраваны ў жывапісных творах В. Дмахоўскага, В. Карпыза, Н. Орды, Ю. Пешкі, Д. Струкава, а таксама на фотаздымках Я. Булгака, А. Віслоцкага, Х. Паддэмбскага. Зборам іканаграфіі шляхецкіх двароў у канцы XIX – пачатку XX ст. займаліся М. Берсах, З. Глогер, Б. Кандратовіч, У. Лушчкевіч, Ю. Ляпкоўскі, К. Маклоўскі.

Раздзел 1.3 **«Тэарэтыка-метадалагічныя канцэпцыі і падыходы»** характарызуюцца метады, якія прымяняліся пры выкананні дысертацыйнага даследавання.

У даследаванні выкарыстоўваюцца структурна-функцыянальны, гісторыка-генетычны і параўнальна-гістарычны метады ў спалучэнні з этнаэкалагічным і этнолага-геаграфічным падыходамі. Ужыванне структурна-функцыянальнага метаду абумоўлена неабходнасцю вызначэння функцыянальных характарыстык

паместнага дваранства як прывілеяванай саслоўнай групы, яе месца ў структуры беларускага этнасу, а таксама характару ўзаемадзеяння з прыродным і сацыяльным асяроддзем Беларусі. Структурна-функцыянальны метад дазваляе таксама вызначыць ключавыя сацыякультурныя функцыі паместнага дваранства ў жыццядзейнасці беларускага этнасу канца XVIII – пачатку XX ст. Гісторыка-генетычны метад ужываецца для выяўлення этапаў развіцця і прычыннасці змен гаспадарчай і сацыяльнай культуры паместнага дваранства, а параўнальна-гістарычны – для аналізу агульных рыс і асаблівасцяў у працэсе тыпалагізацыі феноменаў дваранскай паместнай культуры.

Этнаэкалагічны і этнолага-геаграфічны падыходы, якія ў сваю чаргу засноўваюцца на міждысцыплінарным падыходзе, ствараюць перадумовы для вывучэння сістэмы жыццезабеспячэння і спосабаў адаптацыі паместнага дваранства да прыродна-ландшафтнага і сацыяльна-культурнага асяроддзя краю. Яны дазваляюць даследаваць усю сукупнасць прыродна-абумоўленных формаў сацыяльных паводзін, якія забяспечваюць этнасу адаптацыю, а таксама існаванне за кошт рэсурсаў пэўнага прыроднага асяроддзя, гэта значыць культуру жыццезабеспячэння як комплекс асаблівасцей вытворчай дзейнасці, дэмаграфічнай структуры, працоўнай каапераціі, традыцый спажывання і размеркавання матэрыяльных рэсурсаў, прыродакарыстання і рассялення, сацыянарматыўнай і гуманітарнай культуры. Этнаэкалагічны і этнолага-геаграфічны падыходы маюць на ўвазе ўлік дынамічнага ўзаемадзеяння прыроднай і культурнай падсістэм, што бачыцца плённым таксама пры вывучэнні культуры прыродакарыстання. У якасці агульных прынцыпаў даследавання выкарыстоўваліся метадалагічныя распрацоўкі шэрагу айчынных даследчыкаў: А. І. Лакоткі, А. І. Мальдзіса, М. Ф. Піліпенкі, Л. В. Ракавай, І. У. Чаквіна. Пры аналізе традыцый рассялення быў карысным метадалагічны інструментарый П. Бурдзье, А. Лефеўра і А. М. Ямскова. Пры выяўленні асаблівасцей эканамічных паводзін прадстаўнікоў паместнага дваранства Беларусі ўжываліся канцэпты «сімвалічны капітал» (П. Бурдзье) і «дэманстратыўнае спажыванне» (Ж. Бадрыяр, Т. Веблен, І. Гофман і Н. Эліас).

Такім чынам, у метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання былі пакладзены тэарэтычныя прынцыпы этнаэкалагічнага і этнолага-геаграфічнага падыходаў, а таксама ідэі структуралісцкага канструктывізму (тэорыя практыкі П. Бурдзье), што дазволіла выявіць функцыянальныя ўзаемасувязі паместнага дваранства са знешнім асяроддзем – прыродным і сацыяльным.

У дадзеным даследаванні пад тэрмінам «паместнае дваранства» разумеецца прывілеяваная саслоўная група, якую складалі дваране, што валодалі маёнткамі. Уся сукупнасць дваран-памешчыкаў, якія мелі зямельныя ўладанні на беларускіх землях, разглядаецца як частка прывілеяванай групы беларускага этнасу без увагі на канфесіянальную прыналежнасць і нацыянальнае самавызначэнне асобных яе членаў. Пад сацыякультурнымі працэсамі разумеецца частка механізма этнічнай адаптацыі – змены традыцыйных каштоўнасцей, норм, патрэб, стэрэатыпаў,

якія адбываюцца ў выніку прыстасавання супольнасці да трансфармацый у прыродным і сацыяльна-культурным асяроддзі.

Пры наяўнасці эканамічнай неаднароднасці асноўную частку даследуемай саслоўнай групы ўтваралі памешчыкі сярэдняй заможнасці. Магнатэрыя выступала заканадаўцам моды і правадніком знешніх уплываў, а таксама ініцыятарам інавацый для гэтага асяроддзя. Дробныя землеўладальнікі залежалі ад больш заможных памешчыкаў, арыентуючыся на іх у палітычных і культурных аспектах. Памешчыцкая дваранская супольнасць такім чынам уяўляла сабой адзіную сацыякультурную сістэму. Таму вывады, якія робяцца ў дадзеным даследаванні, калі не агаворваецца асобна, датычаць усёй супольнасці.

Вывучэнне спецыфікі паместнага дваранства як элітарнай групы беларускага этнасу падразумявае вызначэнне асаблівасцей сістэмы жыццезабеспячэння дадзенай сацыяльнай супольнасці, а таксама аналіз яе эканамічных і сацыяльна-культурных функцый, якія дазвалялі адносіць дваран-памешчыкаў да эліты грамадства. Пастаноўка гэтай мэты прадвызначыла логіку структуры дадзенага даследавання.

Глава 2 **«Маёнтак ў сістэме жыццезабеспячэння дваранства»** прысвечана аналізу асаблівасцей сістэмы жыццезабеспячэння і сельскагаспадарчых практык паместнага дваранства, якія былі апасрэдаваны прасторай культурнага ландшафту маёнтка. Маёнтак з'яўляўся асноўным месцам жыццядзейнасці пераважнай часткі прадстаўнікоў айчыннага паместнага дваранства. Ён забяспечваў рэалізацыю матэрыяльна-вытворчай, гаспадарча-бытавой, сацыялізацыйна-выхаваўчай, рэкрэацыйнай і статусна-рэпрэзентатыўнай функцый у сістэме жыццезабеспячэння і ўзнаўлення дваранскай сям'і.

У раздзеле 2.1 **«Дваранскі маёнтак у традыцыйнай сістэме рассялення на беларускіх землях канца XVIII – пачатку XX ст.»** аналізуюцца заканамернасці размеркавання памешчыцкіх маёнткаў на тэрыторыі Беларусі і фарміраванне сядзібнай архітэктурна-планіровачнай структуры. Да найбольш агульных прыродных фактараў, якія фарміравалі ў разглядаемы перыяд заканамернасці размеркавання населеных пунктаў на землях Беларусі, можна аднесці кліматычныя ўмовы, якасць глебы, асаблівасці рэльефу, лясістасць і гідраграфія мясцовасці; сярод сацыяльна-эканамічных – шчыльнасць насельніцтва, ступень урбанізацыі тэрыторыі, наяўнасць транспартнай і вытворчай інфраструктуры.

Развіццё прасторавай структуры дваранскага маёнтка прыводзіла да неабходнасці трансфармацыі прыроднага ландшафту, які пераўтвараўся, набліжаўся да ідэалу. Ардынарнымі мерапрыемствамі было закладанне дрэнажных равоў, выроўніванне дарог, менш распаўсюджанымі – фарміраванне тэрас і сістэмы штучных вадаёмаў, трансфармацыя берагавой лініі азёр ці ўтварэнне штучных азёрных выспаў. Праекты асушэння значных па плошчы балот рэалізоўваліся, як правіла, з цяжкасцю з-за неабходнасці ўзгаднення зямельных інтарэсаў розных памешчыкаў. Трансфармацыя ландшафту мела на мэце ўзмацненне эстэтычнага

аспекту прыроднага атачэння. Для памешчыцкага дома звычайна выбіралася высокае месца – на відавоку ўсёй ваколіцы, з якога можна было бачыць раку ці возера, «вясёлы лясок», «ураджайныя палі», «светлыя дарогі». Стэрэатыпнае ўяўленне аб «прыгожым месцы» з’яўлялася адлюстраваннем імпліцытных ведаў аб аптымальным месцазнаходжанні сядзібы. Напрыклад, выбар пляцоўкі для будаўніцтва памешчыцкага дома на ўзвышшы тлумачыцца не толькі эстэтычнымі ці санітарна-гігіенічнымі ўяўленнямі, але і патрэбай статуснай рэпрэзентацыі землеўладальніка. Высокая статусная прыналежнасць узвышша адпавядае ўстойлівай бінарнай апазіцыі «верх/ніз». Дамінуючыя вышыні давалі некалі ваенна-палітычную перавагу ў кантролі над тэрыторыяй. Яшчэ адной прычынай выбару ўзвышанага месца для памешчыцкай сядзібы была неабходнасць забеспячэння візуальнага кантролю за гаспадаркай. Прэстыжны краявід мусіў уключаць водныя аб’екты, бо акрамя эстэтычнай вартасці яны мелі рэкрэацыйнае і гаспадарчае значэнне, з’яўляліся «дэфіцытным рэсурсам». Магчымасць пабудаваць сядзібу на ўзвышшы каля водных аб’ектаў указвала на высокі статус землеўладальніка і павышала яго сацыяльны прэстыж.

Істотным пры выбары месца для памешчыцкай сядзібы з’яўлялася наяўнасць выгоднага суседства – прысутнасць знаёмых памешчыкаў, суседзяў «добрага роду» – для наладжвання «таварыскага жыцця». Блізкасць мястэчка азначала магчымасць аператыўнага атрымання больш шырокіх паслуг разнастайных спецыялістаў. Аб’ектыўна важным фактарам з’яўлялася наяўнасць надзейнай камунікацыі панскай сядзібы з фальваркамі і вёскамі маёнтка. Таму рацыянальным было размяшчэнне рэзідэнцыі ў цэнтры зямельных уладанняў, аднак падобная планіроўка прымалася далёка не заўжды. Браліся ў разлік і санітарна-экалагічныя фактары, – двор памешчыка мусіў знаходзіцца на «здаровым» – сухім месцы. Улічвалася прыдатнасць зямель паблізу панскага дома для ўладкавання кветнікаў, аранжарэй або сада. На выбар месца ўплывалі таксама пануючыя стылістычныя тэндэнцыі.

Заканамернасці фарміравання архітэктурна-прасторавай структуры дваранскай сядзібы вынікалі таксама з практычных уяўленняў аб гаспадарчай карысці, бяспецы і *выгодах*, паводле якіх, напрыклад, «спіжарня мусіла быць сухой, піўніца халоднай, лядоўня надзейнай». Уяўленні аб «*выгодах*» былі сфармуліраваны як выразны імператыў, патрабаванне якога, аднак, не былі празмернымі. Дом памешчыка, паводле старасвецкаму ўяўленню аб выгодзе, мусіў быць прасторным, каб служыць не толькі гаспадарам, але і шматлікім госцям; грунтоўна збудаваным, каб даваць прытулак некалькім пакаленням роду. Лічылася, што лазня мусіла стаяць блізка ля вады, стайня і сырнік – далей ад двара, псярня – «найменш у паўмілі» ад дома, у двары мусіў быў надзейны гадзіннік і калодзеж, асобныя кухні для сям’і памешчыка і чэлядзі. Старасвецкае ўяўленне аб выгодзе супрацьпастаўлялася новачаснаму заходнееўрапейскаму канцэпту камфорту, крытэрыі якога былі разлічаны на еўрапейскія ўмовы жыцця і ішлі на

шкоду функцыянальнасці мясцовага жылля. Ідэал панскай сядзібы фарміраваўся, дзякуючы творчасці літаратараў, мастакоў, журналістаў і аўтараў гаспадарчых параднікаў.

Дробныя маёнткі маглі складацца з аднаго фальварка, які ў такіх выпадках уяўляў адзінае цэлае з панскім дваром. Фальварак уяўляў сабой тып невялікага пасялення (1–5 двароў) – спецыялізаваную таварную гаспадарку. Сярэдні маёнтак уключаў некалькі фальваркаў і вёсак, а таксама мястэчак. Панскіх дамоў у маёнтку магло быць некалькі, аднак, звычайна, толькі адзін з іх асталёўваўся як рэзідэнцыя. Наяўнасць некалькіх панскіх дамоў у маёнтку, а тым самым магчымасць мець большую прасторавую мабільнасць, непрывязанасць да адной лакацыі, і ў гэтым звязку таксама традыцыя правядзення зімовага сезону ў буйных гарадах па-за межамі маёнтка, з’яўлялася дадатковым спосабам рэпрэзентацыі высокага статусу і ўлады памешчыка над прасторай.

Прастора дваранскага маёнтка з прылягаючымі тэрыторыямі мела трохчасткавую структуру, якую складалі цэнтр, перыферыя і маргіналія. Адміністрацыйным цэнтрам з’яўлялася панская рэзідэнцыя, гаспадарчым дадаткам якой быў фальварак; грамадска-гандлёвым – мястэчка. Адміністрацыйны і грамадска-гандлёвы цэнтры маглі часам супадаць, калі панская рэзідэнцыя пераносілася ў мястэчка. У якасці перыферыі маёнтка выступала вёска, маргіналіі – дробнашляхецкія засценкі і ваколіцы. На тэрыторыі дваранскай сядзібы вылучаліся наступныя функцыянальныя зоны: парадная, жылая, рэкрэацыйная, гаспадарчая і прамысловая. Унутры сядзібы назіралася градацыя прасторавых зон паводле ўяўленняў прэстыжу. Так, можна вылучыць апазіцыю «фасад/задворкі», якую ўвасаблялі парадны і гаспадарчы («задні») двары.

Наяўнасць разгалінаванай рачной сеткі з’яўлялася важным фактарам у развіцці сістэмы рассялення ў краі. Да развіцця чыгуначнай сеткі (у другой палове XIX ст.) у грузаперавозках найпершае значэнне займаў рачны транспарт. Для пасажырскіх перавозак выкарыстоўваўся пераважна наземны транспарт, у першую чаргу, гужавы. З уваходжаннем беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі пачала інтэнсіўна развівацца сістэма паштовых станцый. Традыцыйнымі аб’-ектамі дарожнага сэрвісу Беларусі з’яўляліся корчмы.

У раздзеле 2.2 **«Жыллё і гаспадарчая забудова памешчыцкага двара»** аналізуюцца традыцыі будаўніцтва і прынцыпы арганізацыі прасторы жылых і гаспадарчых будынкаў памешчыцкіх двароў.

Выбар архітэктурнага стылю памешчыцкіх сядзіб з’яўляўся часта актам светапогляднай маніфестацыі землеўладальніка, які праз мову архітэктуры ўпісваў падуладную яму тэрыторыю ў той або іншы грамадска-палітычны кантэкст («еўрапейскі», «імперскі»). Падобны выбар рэалізаваўся найперш ў асяроддзі асвечанай арыстакратыі. Для распрацоўкі архітэктурных рашэнняў айчынных арыстакратычных рэзідэнцый запрашаліся дойліды-прафесіяналы. Палацы ары-

стакратыі з'яўляліся ўзорам для будаўніцтва ў дварах сярэдніх і дробных землеўладальнікаў. Дзякуючы падобнаму культурнаму трансферу ў айчынным сядзібным будаўніцтве традыцыйнымі зрабіліся такія архітэктурныя элементы, як мезаніны з барочным абрысам, «ламаны» дах, порцік-ганак. Аднак большасць памешчыкаў не карысталася паслугамі архітэктараў. Распаўсюджанай заставалася практыка, калі будаўніцтва пачыналася без складання архітэктурнага праекту.

«Трываласць» і «зручнасць» з'яўляліся стэрэатыпнымі патрабаваннямі да старасвецкага памешчыцкага жылля, што мусіла забяспечвацца якасцю матэрыялаў і майстэрствам работнікаў. Лепшым матэрыялам для драўляных дамоў лічылі лістоўніцу. Найбольш распаўсюджаным – заставалася хвоя, меней – дуб. Цэглу для будаўніцтва памешчыкі часта выраблялі на ўласных цагельнях. Сядзібны дом быў прызначаны служыць не толькі сям'і памешчыка, але таксама гасцям і чэлядзі. Можна ўмоўна вылучыць тры зоны, якія забяспечвалі вітальныя функцыі ўсіх насельнікаў: публічную, ці рэпрэзентатыўную (сені/вестыбюль, салон, гасціная, сталовая), прыватную (спальныя пакоі, гардэроб ці камора) і змешаную, або гаспадарчую (кухня). Жыллё дробнапамесных землеўладальнікаў, а таксама фальварковыя будынкі захоўвала традыцыйную планіроўку (ізба + сенцы + ізба) і складаліся з чатырох-пяці пакояў. Дом землеўладальніка сярэдняй заможнасці (ад сямі да дзесяці пакояў) дзяліўся на парадную і прыватную часткі. Вялікапанскія сядзібы ўтрымлівалі больш за дзесяць пакояў. Калі дом быў двухпавярховы, парадная і прыватная паловы знаходзіліся кожная на сваім узроўні. Памешчыцкія дамы ў першай палове XIX ст. мелі анфіладную (двух- або аднарадную) планіроўку, зрэдку – калідорную. Апошняя атрымала большую распаўсюджанасць у другой палове XIX – пачатку XX ст. Выкарыстоўваўся і змешаны тып унутранай арганізацыі пакояў.

Уваход з ганка вёў у сенцы, якія размяшчаліся ў цэнтры дома. Наступным за сенямі памяшканнем на «белай» палове магла быць гасцёўня («святліца» ці «бавяльная», пазней салон). Невялікае памяшканне, якое прымыкала да гасцёўні, называлася бакоўкай. З гасцёўняй часта межавала сталовая. У глыбіні дома, часта ў кутніх памяшканнях, знаходзіліся спальныя пакоі. З 40−50-х гг. XIX ст. памяшканні ў памешчыцкіх дамах пачалі дыферэнцыравацца паводле рознай функцыянальнай прыналежнасці. У пачатку XX ст. лічылася, што вышыня пакоя не павінна быць меншай 1,16 сажня. Звычайная вышыня памяшкання памешчыцкага дома складала 4,5 локця («палтара хлопа»). У жылых пакоях было 1−2 вокны, у парадных (сталовая, святліца, гасцёўня, зала) – 3−10, без вокнаў заставаліся нежылыя памяшканні. Найчасцей ужывалася шкло мясцовай вытворчасці. Для асвятлення пакояў памешчыцкага дома выкарыстоўваліся разнастайныя прыстасаванні: на сценах прымацоўвалі свечнікі, да столі падвешвалі люстры, на камінах і століках стаялі жырандолі. Галоўным элементам сістэмы ацяплення памешчыцкага дома з'яўлялася печ, дадатковым – камін. Пры аздабленні інтэр'ераў

памешчыцкіх сядзіб умоўна вылучаліся два падыходы: старасвецкі і новачасны. Новачасныя густы патрабавалі знешняй эфектнасці ў абсталяванні арыстакратычных рэзідэнцый, а старасвецкія – зручнасці. Гаспадарчыя і службовыя будынкі маёнтка размяшчаліся на тэрыторыі рэзідэнцыі, а таксама выносіліся асобна ў фальваркі. Ступень спецыялізацыі гаспадарчых і службовых будынкаў залежала ад фінансавых магчымасцей памешчыка.

У раздзеле 2.3 **«Традыцыйныя сельскагаспадарчыя практыкі»** аналізуюцца традыцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Можна вылучыць рэгіёны, у якіх асаблівая ўвага надавалася пэўнай сельскагаспадарчай культуры. Напрыклад, на Мсціслаўшчыне, у Гомельскім павеце ў структуры палявых культур пераважала грэчка. На вырошчванні лёну спецыялізаваліся паўночна-ўсходнія і паўночныя паветы Віцебскай губерні, а таксама шэраг паветаў Магілёўскай і Віленскай губерняў. Дынаміка росту агульнай пасяўной плошчы, структура пасеваў змяняліся ў залежнасці ад кан’юнктуры цэн, прыродна-кліматычных асаблівасцей рэгіёнаў і грамадска-палітычных абставінаў (напрыклад, наступстваў вайны 1812 г. або рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг.). У памешчыцкіх гаспадарках на беларускіх землях яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай найбольш распаўсюджанай з’яўлялася трохпольная сістэма севазвароту. Пры трохпольнай сістэме поле дзялілі на тры па магчымасці роўныя часткі. Адзін палетак апрацоўваўся пад азімае жыта (у некаторых рэгіёнах – пшаніцу), на другім – высявалі ярыну (гэта магло быць жыта, пшаніца, ячмень, авёс, бульба, гарох або грэчка), трэці – знаходзіўся пасля зняцця ярыны пад папарам і выкарыстоўваўся для выпасу свойскай жывёлы. У рэгіёнах з недахопам зямлі распаўсюджанай з’яўлялася двухпольная сістэма. Прыкладам шматпольнай сістэмы можа служыць наступная схема: першае поле – пад папарам; другое – засеянае жытам; трэцяе – пятае – канюшынай; шостае – аўсом; сёмае – бульбай, гарохам, ячменем, вікай. Найчасцей арганізоўвалася чатырохпольная сістэма з увядзеннем у севазварот бульбы і кармавых траваў: у першы год на чвэрці палеткаў высявалі жыта, потым – яравыя, на трэці – бульбу або кармавыя травы, на чацвёртым – гэты ўчастак знаходзіўся пад папарам.

На пачатку XIX ст. толькі адзінкавыя гаспадаркі займаліся лугаводствам, у большасці выпадкаў для выпасу выкарыстоўваліся асушаныя балоты, узбярэжжа азёр і рэк. Недастатковае развіццё лугаводства тлумачылася сучаснікамі наяўнасцю значнай колькасці прыродных сенажацяў. Аднак у многіх рэгіёнах існаваў недахоп якасных сенажацяў і паш. Спробы ўвесці прынцыпы рацыянальнага лесакарыстання сустракаліся пераважна ў казённых лясах. Гаспадарам прыватных лясных участкаў не хапала элементарных ведаў аб вядзенні лясной гаспадаркі, што адбівалася на даходах ад гэтага роду дзейнасці, якія былі нестабільныя, а таксама прыводзіла часам да вынішчэння каштоўных лясных угоддзяў у асобных мясцовасцях. Распаўсюджанай з’яўлялася спажывецкая ўстаноўка ў адносінах да прыродных рэсурсаў («Nie było nas, był las, nie będzie nas, będzie las»).

У памешчыцкіх гаспадарках хутчэй у параўнанні з сялянскімі ўводзіліся новыя культуры. Асноўным прыродным маркерам, які прадвызначаў тэрміны пачатку сельскагаспадарчых работ у полі, было вызваленне глебы ад снегу. У значнай ступені гэтыя тэрміны вызначаліся традыцыяй, якая арыентавалася на пэўныя рэлігійныя святы. Звярталася ўвага таксама на метэаралагічнае становішча. На рашэнне аб пачатку сяўбы ўплывалі і рэкамендацыі сельскагаспадарчых календароў. На вызначэнне дня пачатку ці сканчэння сяўбы ўплывалі таксама прыкметы і прымхі, напрыклад, гарох высаджваўся ў дні, якія не мелі ў сваёй назве літары «р», бо польскае слова чарвяк (robak) пачыналася з гэтай літары. Асноўны перыяд палявых работ працягваўся ў розных беларускіх рэгіёнах ад пяці да шэсці месяцаў і займаў 180−200 дзён. Агародная гаспадарка ўладкоўвалася звычайна паблізу памешчыцкіх сядзіб і знаходзілася пад апекай жанчын. У адрозненне ад сялянскага, памешчыцкія агароды мелі больш разнастайны асартымент, лепш угнойваліся і даглядаліся. Маркерам сацыяльнага статусу з’яўлялася наяўнасць аранжарэі і цяпліцы. Многія дваранскія маёнткі мелі сады. З-за прыродна-кліматычных асаблівасцей рэгіёна менш развітае было садаводства ў Віцебскай губерні.

Адной з вядучых галін на працягу даследуемага перыяду заставалася конегадоўля. Выключна важнае значэнне конегадоўлі для функцыянавання мясцовага гаспадарчага жыцця знаходзіла адлюстраванне ў моўнай карціне свету. Конь – адзін з найбольш папулярных герояў беларускіх народных казак, фразеалагізмаў, устойлівых параўнанняў, прымавак і прыказак. Рост удзельнай вагі малочнай і мясной жывёлагадоўлі адзначаўся ў буйных памешчыцкіх маёнтках, на базе якіх фарміраваліся гаспадаркі, арыентаваныя на патрэбы рынку. Аднак у большасці памешчыцкіх фальваркаў прычынамі ўтрымання вялікай колькасці кароў, авечак, свіней і свойскай птушкі былі не прамысловыя мэты і патрэбы забеспячэння жыхароў маёнткаў харчаваннем, а вострая неабходнасць у атрыманні ўгнаення.

Рыбаводства ў маёнтках з’яўлялася хутчэй відам баўлення вольнага часу. Пчалярства разглядалася як адна з найбольш прыбытковых галін айчыннай сельскай гаспадаркі, аднак мясцовыя пчаляры ў сваёй большасці не засвоілі рацыянальных спосабаў гадоўлі пчол. Традыцыйныя ж тэхнікі ляснога бортніцтва ў другой палове XIX − пачатку XX ст., калі змяншаліся плошчы лясоў, рабіліся малаэфектыўнымі.

Назіралася пэўная спецыялізацыя ў залежнасці ад маёмаснага становішча землеўладальнікаў. Так, дробныя памешчыкі гадавалі коз, больш увагі надавалі свойскай птушцы; буйныя памешчыкі маглі ўтрымліваць конезаводы і значныя статкі пародзістых авечак. У буйных гаспадарках праводзілася селекцыйная работа з мясцовымі пародамі свойскай жывёлы; выкарыстоўваліся дасягненні сусветнай і айчыннай аграрнай навукі; арганізоўваўся працэс перадачы перадавога вопыту, з мэтай чаго ўтвараліся таварыствы, выдавалася спецыяльная літаратура; рабіліся спробы пашырэння рацыянальных гаспадарчых ведаў у сялянскім асяроддзі.

Глава 3 **«Трансфармацыя эканамічнай культуры памеснага дваранства Беларусі»** прысвечана аналізу развіцця эканамічнай культуры памеснага дваранства Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

У раздзеле 3.1 **«Гаспадарчая арганізацыя ў дваранскіх маёнтках Беларусі: традыцыйныя і інавацыйныя падыходы»** аналізуюцца спосабы і прынцыпы гаспадарчай арганізацыі ў маёнтках Беларусі. У 30−50-х гг. XIX ст. з нарастаннем у Расійскай імперыі крызісу прыгоннай сістэмы і зніжэннем прыбытковасці маёнткаў памешчыкі пачалі звяртаць большую ўвагу на заходнееўрапейскі вопыт гаспадарання. Тэарэтычным увасабленнем апошняга з'яўлялася мадэль рацыянальнай сельскай гаспадаркі, якая атрымала прызнанне ў значнай ступені дзякуючы кнігам Альбрэхта Тэера. Папулярызатарам ідэй нямецкага вучонага на беларускіх землях быў яго вучань, прафесар Віленскага ўніверсітэта М. Ачапоўскі. Многія рэкамендацыі А. Тэера, у прыватнасці, па ўвядзенні шматпольнага севазвароту, знаходзілі практычнае ўвасабленне ў перадавых памешчыцкіх гаспадарках краю, напрыклад, у Шчорсах Храптовічаў. Адной з першых айчынных спроб папулярнага апісання ўзорнай мадэлі гаспадарання на аснове рацыянальных прынцыпаў з'яўлялася работа Г. Цюндзявіцкай «Gospodyni litewska [...]». Пасля скасавання прыгоннага права шырока абмяркоўваліся перспектывы развіцця ў краі прамысловасці, сельскагаспадарчай адукацыі, крэдыту, страхавання маёмасці і жыцця. Аднак укараненне новых метадаў гаспадарання адбывалася паволі і з пэўнымі выдаткамі. Задачы эканамічнай мадэрнізацыі ўсведамляліся памешчыкамі, але пераносіліся імі на будучыню. Толькі адзінкавыя гаспадаркі, арганізаваныя на рацыянальных пачатках, дэманстравалі ўпэўнены рост і спрыялі пашырэнню новых падыходаў у асяроддзі не толькі памешчыкаў, але і сялян.

Ва ўмовах існавання прыгоннай гаспадаркі з нізкай матываванасцю работнікаў да працы патрэба арганізацыі эфектыўнай сістэмы кантролю набывала прынцыповы характар. Арганізацыя сістэмы кантролю вымагала выдзялення спецыяльнага штату супрацоўнікаў з адпаведнымі функцыямі. Адным з элементаў сістэмы кантролю ў памешчыцкім маёнтку з'яўлялася практыка распрацоўкі і прымянення розных форм уліковай дакументацыі. Ступень эфектыўнасці кантролю ў многім залажала ад асабістага ўдзелу гаспадара маёнтка ў гаспадарчым працэсе. Аднак памешчыкі часта перадаручалі свае абавязкі «некампетэнтным і хцівым» аканомам або здавалі фальваркі ў арэнду.

Арганізацыя сельскагаспадарчай працы на беларускіх землях мела экстэнсіўны характар і вымагала вялікіх рэсурсаў, у тым ліку рабочай сілы. Малаэфектыўныя формы вядзення гаспадаркі пераважалі ў сярэдніх і малых маёнтках, у якіх памешчыкі клапаціліся аб павелічэнні плошчаў ворнай зямлі, не звяртаючы ўвагу на якасць апрацоўкі глебы. У гэтых абставінах механізацыя працы ўсведамлялася многімі прагрэсіўнымі землеўладальнікамі як абавязковая перадумова для паспяховага гаспадарання. Рабочая жывёла, сіла вады і ветру традыцыйна выкарыстоўваліся на беларускіх землях у працы млыноў, тартакоў, сукнавальняў, малатарняў і алейняў. Асабліва высокай ступенню механізацыі ў першай

палове XIX ст. вызначаліся тэхналагічныя працэсы на мануфактурах у суконнай прамысловасці. У 20-х гг. XIX ст. назіраліся першыя спробы ўкаранення на падобных прадпрыемствах паравых машын. Актыўная тэхнічная мадэрнізацыя праводзілася таксама на вінакурнях і броварах краю. У цэлым у дарэформенны перыяд паравыя машыны не атрымалі шырокай распаўсюджанасці ў мясцовай прамысловасці. Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў парэформенны перыяд была больш спрыяльнай для ўкаранення тэхнічных інавацый. Аднак і ў парэформенны перыяд заснаванне інавацыйных прадпрыемстваў было звязана з высокай эканамічнай рызыкай.

Дваранская памешчыцкая гаспадарка пры наяўнасці эканамічных праблем захоўвала на працягу разглядаемага перыяду істотны запас устойлівасці, адной з галоўных крыніц якой з'яўлялася эксплуатацыя сялян, што складалі большасць мясцовага насельніцтва. Інтэнсіўнасць эксплуатацыі прыгонных абмяжоўвалася рацыянальнымі патрэбамі ўзнаўлення працоўных рэсурсаў. Аднак танная праца не спрыяла ўкараненню інавацый, і пры развіцці рыначных адносін праяўлялася тэндэнцыя да зніжэння даходнасці маёнткавай гаспадаркі, што кампенсавалася арганічным для дадзенай сістэмы гаспадарання спосабам – экстэнсіўным пашырэннем маштабаў выкарыстання рэсурсаў, у тым ліку працоўных. Аднак механізм патрыярхальнай апекі функцыянаваў са значнымі абмежаваннямі. Ён быў не здольны спыніць далейшую дэградацыю працоўных рэсурсаў і гаспадаркі прыгонных. Стымуляванне росту спажывання алкаголю сярод сялян і дробнай шляхты ў многіх памешчыцкіх гаспадарках рабілася абавязковай умовай паспяховага функцыянавання эканамічнай мадэлі маёнтка. Дзякуючы гэтаму гарантаваўся збыт гарэлкі з памешчыцкіх вінакурняў, павялічвалася прывабнасць арэнды корчмаў; сяляне рабіліся больш залежнымі і лаяльнымі да ўлады пана. У многіх схемах разліку памешчыкамі за сялянскую працу алкаголь служыў сурагатам грошай і часта выступаў як сродак матывацыі сялян да працы.

У раздзеле 3.2 **«Эканамічныя паводзіны: дэманстрацыйнае спажыванне, ашчаднасць і крэдыт»** аналізуюцца асаблівасці эканамічных паводзін памеснага дваранства. Факт спажывання пакупнога прадукту – «мантацтва» з пункту гледжання дробнага землеўладальніка – з'яўляўся маркерам высокага сацыяльнага статусу. Наяўнасць імпартных спецый, цукру, солі ў рацыёне харчавання, і найперш аб'ёмы іх выкарыстання дэманстравала сур'ёзнасць сацыяльных амбіцый сямейства. Таму не толькі тлустыя, спажыўныя, але таксама вострыя і салёныя стравы на памешчыцкім стале сведчылі аб прэтэнзіях на высокую статуснасць. Для дробных і нават сярэдніх па заможнасці землеўладальнікаў магчымасць выбару стратэгіі дэманстрацыйнага спажывання была абумоўлена практыкай ашчаднасці і накаплення. Значных выдаткаў у сем'ях прадстаўнікоў прывілеяваных груп патрабавалі абнаўленне гардэробу; наём слуг; арганізацыя палявання; утрыманне прэстыжнага выезду. Адным з атрыбутаў арыстакратычнага ладу жыцця з'яўлялася філантрапічная дзейнасць. Меркаванні прэстыжу

вымагалі значных выдаткаў у выпадку прыёму гасцей. Беларускія памешчыкі значную частку сваіх даходаў выдаткоўвалі на разнастайныя святкаванні. Гаспадарчыя задачы і ў значнай ступені жыццё не па сродках вымушалі памешчыкаў браць крэдыт. Часта грошы, узятыя пад мэты мадэрнізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, накіроўваліся на ліквідацыю старых даўгоў, якія ўзнікалі ў выніку некампетэнтнага гаспадарання. Немагчымасць эфектыўна спаганяць запазычанасць з даўжнікоў сфарміравала крызіс даверу і дэфіцыт даступнага прыватнага крэдыту ў краі.

У раздзеле 3.3 **«Каштоўнасныя дэтэрмінанты камерцыйнага і вытворчага прадпрымальніцтва памешчыкаў»** аналізуюцца асаблівасці матывацыі эканамічнай дзейнасці прадстаўнікоў паместнага дваранства Беларусі. Гандлёвае прадпрымальніцтва традыцыйна разглядалася ў асяроддзі мясцовага прывілеяванага саслоўя як справа маральна сумнеўная і эканамічна небяспечная. Падставы негатыўных адносін прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя да заняткаў гандлем былі сфарміраваныя ў рэаліях саслоўнага феадальнага грамадства, у якім ваенная арыстакратыя атрымлівала шырокія правы і гарантыі захавання свайго выключнага статусу ад замахаў іншых сацыяльных груп, што замацоўвалася нормамі права. Для эпохі Асветніцтва характэрнымі былі спрэчкі аб новых функцыях дваранства ў грамадстве, у тым ліку аб мэтазгоднасці ўдзелу прадстаўнікоў арыстакратыі ў камерцыйнай дзейнасці.

У Расійскай імперыі быў прынят шэраг заканадаўчых актаў, якія спрыялі дваранам уваходжанне ў сферу гандлю. Аднак сярод памешчыкаў заставаўся трывалым агульны скептычны настрой у дачыненні да занятку гандлем. Распаўсюджаным было стэрэатыпнае меркаванне, паводле якога лічылася, што «народ наш не схільны да рамёстваў і гандлю». Фразеалагізм «зарабіць як Заблоцкі на мыле» («wyjść jak Zabłocki na mydle») ілюструе падобны скепсіс. Нежаданне мясцовых памешчыкаў асабіста займацца гандлем прывяло да фарміравання на землях Беларусі адмысловага інстытута пасрэдніцтва. Ролю пасрэднікаў («фактараў») пры продажы і куплі тавараў, іншых эканамічных здзелак выконвалі яўрэі. У дарэформенны перыяд прамысловая дзейнасць для памешчыкаў з’яўлялася факультатыўным заняткам, яна не вызначала іх грамадскі статус і дабрабыт. Да мануфактурнай вытворчасці прыцягваліся прыгонныя сяляне, якія былі нематываваныя вынікам сваёй працы. У парэформенны перыяд недастатковае развіццё прамысловасці ў краі тлумачылася адсутнасцю значных мясцовых капіталаў і прадпрымальнасці, недахопам рабочых рук, традыцыйнай сельскагаспадарчай спецыялізацыяй, нерацыянальным характарам мясцовай эканомікі, рэпутацыяй беднага рэгіёна.

Глава 4 **«Механізмы сацыякультурнага ўзнаўлення саслоўнай групы паместнага дваранства Беларусі»** прысвечана аналізу механізмаў сацыякультурнага ўзнаўлення саслоўнай групы паместнага дваранства Беларусі.

У раздзеле 4.1 **«Сацыяльная арганізацыя памешчыцкага двара і практыкі падтрымання ўнутрысаслоўнай салідарнасці»** аналізуюцца асаблівасці сацыяльнай арганізацыі памешчыцкага двара і практык падтрымання ўнутрысаслоўнай салідарнасці. Памешчыцкія двары Беларусі мелі складаную сацыяльную арганізацыю з шматузроўневай сістэмай стратыфікацыі. Насельніцтва памешчыцкіх двароў складалася з трох галоўных груп: сям'і памешчыка, афіцыялістаў і чэлядзі. Найбольш разгалінаваную ўнутраную дыферэнцыяцыю мела група афіцыялістаў (служачых). Дворскую службу абіралі як выхадцы з асяроддзя дробнай шляхты, так і прадстаўнікі сярэдніх па заможнасці памешчыцкіх колаў. Аднак мэты і матывы іх выбару адрозніваліся: дзеці заможных землеўладальнікаў спасцігалі на магнацкім двары свецкую навуку, а дзеці беднай шляхты зараблялі на жыццё. Найбольшай каштоўнасцю дворскай службы з'яўляліся тыя асабістыя адносіны, якія завязваліся ў служачага з панам. Апошняе ілюструе старажытны звычай, калі праз тры гады выслугі (навіцыяту) пан падчас банкета біў дворскага па твары, каб той «помніў панскую ласку», потым падвязваў яму на бок шаблю, піў за яго здароўе і даваў каня з сядлом. Гэта была плата за тры гады службы, і найбольшай узнагародай для служачага ў кантэксце дадзенага звычаю з'яўлялася ўвага пана. У некаторых дварах падобная працэдура адбывалася, калі афіцыяліст пераходзіў з статусу «хлопца» на пасаду пакаёвага. За добрую службу, вернасць сваім палітычным і эканамічным інтарэсам пан аддаваў у арэнду фальваркі за памяркоўную цану, складаў пратэкцыю для далейшай кар'еры, выплачваў пажыццёвую пенсію, выгадна жаніў. Усё сямейства шляхціца паступала пад апеку больш магутнага панскага роду.

Ідэалагема роўнасці ўсіх прадстаўнікоў «народа шляхецкага» паміж сабой была народжаная ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай і выконвала функцыі мабілізацыі і кансалідацыі эліты. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ідэалагема роўнасці працягвала сваё існаванне ў асяроддзі мясцовага шляхецтва, у чым былі зацікаўленыя розныя групы прывілеяванага саслоўя. Галоўным выгадаатрымальнікам у справе кансалідацыі «народу шляхецкага» з'яўлялася арыстакратыя. Аднак карысць атрымлівалі і дробныя землеўладальнікі – буйныя памешчыкі не адчувалі сябе ў поўнай ступені свабоднымі ад грамадскай думкі дробнашляхецкага асяроддзя. Тэзіс аб шляхецкай роўнасці звычайна не аспрэчваўся, аднак ён насіў відавочны для ўсіх дэкларатыўны характар, што знайшло адлюстраванне ў мове, напрыклад, у беларускіх выслоўях («Вялікі пан – падраны жупан»; «Гэтакія паны – па тры (пары) у штаны»; «Такі пан, што ў саломе спіць, а зубамі блохі б'е»; «Сярмяга не знявага, а жупан не вялікі пан»). Наяўнасць такіх слоў як «шляхетка», «шляхтун», таксама сведчыла пра неаднолькавую вагу шляхецкага статусу. Акрамя таго, з пачаткам рэалізацыі палітыкі разбору шляхецкага саслоўя сам тэрмін «шляхта» набыў сэнсавае адценне ніжэйшасці ў дачыненні да слова «дваранін». Шляхціцы звярталіся адзін да аднаго, выкарыстоўваючы слова «браце» ці «сястра». Аднак дадзены зварот быў магчымы толькі да асоб, якія стаялі ніжэй

у сацыяльнай іерархіі. Для тытулаваных персон існавалі іншыя варыянты гэтага звароту: пане-браце, мосці пане-браце, пан-дабрадзей, ваша міласць (скарочана – вашмосць, васць), ягамосць/яемосць, васпан/васпані, ці больш фармалізавана – вяльможны пан. Перад буйнымі землеўладальнікамі шляхта выяўляла «лісліvasць, паслужлівасць і запабяганні». Шырока прымяняліся формулы самапрыніжэння: «падаю да Вашых ног», «цалую Вашы ногі», «сцялюся пад Вашы ногі (стопы)», «я Ваш найніжшы слуга». Захоўваўся звычай цалаваць пры вітанні руку гаспадара маёнтка дзецьмі, крэўнымі і дваровымі. Жонка цалавала руку мужа ў найбольш урачыстыя моманты, напрыклад, на імяніны. Існаваў звычай цалавання ног бацькі і маці дарослымі дзецьмі пры сустрэчы з імі пасля разлукі. Дзяўчаты маглі цалаваць рукі старых жанчын, мужчыны – радавітых паняў. На паклон мужчыны жанчына адказвала кніксенам (дыгам).

У раздзеле 4.2 **«Сямейнае выхаванне і адукацыя: традыцыі мемарыялізацыі радавой гісторыі і фарміравання гістарычнай свядомасці ў памешчыцкім маёнтку»** аналізуюцца традыцыі сямейнага выхавання і хатяй адукацыі ў памешчыцкіх сем’ях Беларусі. У беларускай традыцыі ўзроставыя межы дзяцінства рэгламентаваліся нормамі Статута ВКЛ 1588. Існавалі традыцыйныя практыкі, якія мусілі сімвалічна падкрэсліваць пераход дзіцяці ў свет дарослых. Для хлопчыкаў такім сімвалічным актам магло быць запрашэнне абедаць з дарослымі, якое звычайна адбывалася ў 18-гадовым узросце. Для дзяўчат – апрананне ў доўгія сукні з 15-гадовага ўзросту. Характар абрадаў пераходу ў каталіцкіх сем’ях мелі першая прычасць (прымалі дзеці 7–10 год) і канфірмацыя (14–18 год). Хлопчыкі-падлеткі, якія прыязджалі ўлетку да бацькоў з сябрамі на вакацыі, часам начавалі ў лямусах – такім чынам падкрэслівалася пэўная аўтаномнасць маладога чалавека.

Выхаванне ў арыстакратычных сем’ях насіла звычайна праектны характар і было арыентаванае на пэўны педагагічны ідэал. Уяўленні аб дасканалай асобе ў асяроддзі заможных землеўладальнікаў фарміраваліся пад уплывам розных фактараў, сярод якіх варта адзначыць педагагічныя тэорыі эпохі. Узоры і ідэалы для пераймання прадстаўляла таксама мастацкая літаратура. На педагагічны ідэал уплывалі палітычныя перакананні бацькоў. У кансерватыўных («старапольскіх», «сармацкіх») сем’ях дзяцей выхоўвалі ў рэлігійнай веры, заахвочвалі да сціпласці і пачцівасці ў паводзінах з дарослымі, літасці да бедных, вучылі прыняццю сацыяльнай іерархіі. Арыстакратычнае выхаванне ў асветніцкім духу ўключала ідэалы самадысцыпліны і рацыянальнасці, а таксама парадку, унармаванасці, сістэмнасці ў дзеяннях, што магло, напрыклад, рэалізавацца праз расклад дня для дзяцей. Дзяцей маглі вучыць абмяжоўваць сябе ў сродках, вызначаючы для іх невялікае грашовае ўтрыманне, якое не прадугледжвала раскошы ці вялікага камфорту.

Ідэал выхавання адрозніваўся не толькі ў розных класавых асяродках, але і ў межах адной сям’і, напрыклад, пры выхаванні дзяўчат і хлопчыкаў. Існавалі

адрозненні ў выхаванні старэйшых (будучых спадкаемцаў) і малодшых дзяцей. Аднак некаторыя кампаненты выхавання з'яўляліся ўніверсальнымі: памешчыкі хацелі бачыць сваіх дзяцей рэлігійнымі, паслухмянымі, таварыскімі і здаровымі. Выхаванне ў памешчыцкіх сем'ях засноўвалася на сямейна-радавых і саслоўных каштоўнасцях, што падразумявала актуалізацыю гістарычнай памяці. З гісторыяй краю памешчыцкія дзеці знаёміліся найперш праз біяграфіі сваіх продкаў.

Педагагічныя практыкі ў дваранскім маёнтку распаўсюджваліся не толькі на дзяцей. Традыцыйная сямейная мадэль прадугледжвала, што муж будзе выконваць педагагічныя абавязкі ў дачыненні сваёй жонкі. Акрамя таго, сям'я памешчыкаў здзяйсняла педагагічную функцыю адносна матэрыяльна залежнай ад іх дробнашляхецкай кліентэлы і прыгоннага сялянства. Сярод прадстаўнікоў сярэднезаможнай і дробнай шляхты заможныя і радавітыя памешчыцкія сем'і разглядаліся як узор для пераймання. Такім чынам гаспадары заможных маёнткаў не толькі былі прыкладам для ўласных дзяцей, але і выконвалі больш шырокую патрыярхальную місію ў сваім сацыяльным асяроддзі. У выхаванні малодшых гадаванцаў памешчыцкай сям'і бралі ўдзел прадстаўнікі шырокага кола членаў роду, найперш бліжэйшыя сваякі, хросныя бацькі. Ускосна ў выхаваўчым працэсе маглі ўдзельнічаць іншыя прадстаўнікі «вялікай памешчыцкай сям'і» – чэлядзь і рэзідэнты. Усе пералічаныя групы складалі сацыялізуючае асяроддзе дваранскага маёнтка, у якім фарміравалася дзіцячая асоба. З'яўляючыся асяроддзем, у якім акумуляваліся сямейныя традыцыі і гісторыя, сядзіба ўплывала на фарміраванне саслоўна-радавой ідэнтычнасці і гістарычнай свядомасці. Важнае значэнне надавалася хатняй адукацыі. Сярод яе найбольш істотных задач вылучалася падрыхтоўка да паступлення ў публічныя школы або гімназіі, а таксама больш глыбокае, чым гэта забяспечвалася школьнай праграмай, засваенне замежных моў і дысцыплін эстэтычнага цыклу.

У раздзеле 4.3 **«Традыцыі гасціннасці ў культуры паместнага дваранства Беларусі»** аналізуюцца традыцыі гасціннасці ў культуры паместнага дваранства Беларусі. Сярод прадстаўнікоў паместнага дваранства краю гасціннасць прызнавалася традыцыйнай каштоўнасцю і ўспрымалася як адзнака арыстакратычнага ладу жыцця. Рацыянальнымі падставамі гасціннасці часта з'яўляліся матрыманіяльныя разлікі або палітычныя меркаванні, напрыклад, з увагі на будучыя выбары ва ўстановы дваранскага самакіравання. Гасціннасць падкрэслівала статус памешчыцкага дому. Узровень прыняцця госця быў маркерам сацыяльнага становішча гаспадароў. Нагодай для збору не толькі сваякоў, але і суседзяў з'яўляліся святы і сямейныя ўрачыстасці. Найчасцей гэта былі імяніны, хрэсьбіны, заручаны, вяселле. Госці таксама масава запрашаліся на пахаванне, наваселле, масленіцу, паляванне, у выпадку атрымання гаспадаром пасады. Аднак для наведвання блізкіх суседзяў не патрабавалася істотнай нагоды. Формай рэалізацыі традыцый гасціннасці з'яўляўся інстытут рэзідэнтаў. Злоўжываннем хлебасольнасцю гаспадара ў мясцовага паместнага дваранства лічылася, калі нязваны госць

дужа часта наведваўся, або надта доўга гасцяваў (больш за тры дні), або прыводзіў з сабой шмат слуг ці сяброў. Традыцыя прыёму госця мае рытуалізаваны характар і выразную структуру, што ўключае шэраг устойлівых сітуацый (сустрэча госця, застолле, праводзіны).

Мясцовае памеснае дваранства выдаткоўвала на арганізацыю таварыскіх сустрэч значную частку даходаў. На вялікіх дварах існавала асобная інфраструктура, якая забяспечвала функцыянаванне традыцыі гасціннасці. Адпаведна прадугледжвалася складаная наменклатура пасад. Памешчыцкая хлебасольнасць распаўсюджвалася пераважна толькі на асоб аднаго сацыяльнага кола і не датычылася шырокіх народных мас. Аднак у пэўныя ўрачыстасці і святы сяляне маглі разлічваць на дапамогу з боку пана. Найбольш маштабнае ўзаемадзеянне паміж памешчыкамі і сялянамі ў межах патрыярхальных адносін адбывалася падчас дажынак.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Асноўным месцам жыццядзейнасці пераважнай часткі прадстаўнікоў айчыннага памеснага дваранства быў маёнтак. Размяшчэнне ў прасторы ландшафту дваранскіх памешчыцкіх сядзіб з'яўлялася вынікам узаемадзеяння прыродных і сацыяльна-эканамічных фактараў. Сярод прыродных фактараў вылучаюцца кліматычныя ўмовы, якасць глебы, асаблівасці рэльефу, лясістасць і гідраграфія мясцовасці; сярод сацыяльна-эканамічных – шчыльнасць насельніцтва, ступень урбанізацыі тэрыторыі, наяўнасць транспартнай і вытворчай інфраструктуры. Існавалі аб'ектыўныя перадумовы, якія спрыялі раўнамернасці разгрупавання памешчыцкіх двароў па тэрыторыі Беларусі: высокая ступень падабенства беларускіх раўнінных ландшафтаў, а менавіта наяўнасць разгалінаванай сеткі суднаходных і сплаўных рэк; адносная аднастайнасць узроўню ўрбанізацыі тэрыторыі і размеркавання працоўных рэсурсаў. Варыятыўнасць мясцовых эканамічных і палітычных фактараў заставалася недастаткова значнай, каб сфарміраваць у выніку развіцця дваранскага маёнтка на беларускіх землях выразныя рэгіянальныя тыпы разгрупавання па тэрыторыі. Памешчыцкае асяроддзе вызначалася значнай уніфікаванасцю элементаў матэрыяльнай і гаспадарчай культуры. Аднак у заходняй і цэнтральнай частцы Беларусі, дзе ў свой час паслядоўна праводзілася валочная памера, адзначалася большая канцэнтрацыя сярэдніх і буйных дваранскіх маёнткаў.

На працягу разглядаемага перыяду пры фарміраванні планіровачнай структуры памешчыцкіх маёнткаў можна адзначыць паступовае зніжэнне залежнасці ад прыродных фактараў. Пры выбары месца пад будаўніцтва дваранскай сядзібы, яе архітэктурна-планіровачнага рашэння, землеўладальнікі кіраваліся меркаваннем аб «выгодзе» – комплексам эстэтычных, санітарна-экалагічных, гаспадарчых уяўленняў аб ідэальным памешчыцкім двары (ацэнкамі прэстыжнасці, бяспекі, функцыянальнасці разглядаемай тэрыторыі). Генезіс дадзенага

ідэалу можна прасачыць ад эпохі рэалізацыі «валочнай памеры» ў ВКЛ (2-й паловы XVI ст. – пачатку XVII ст.). На працягу XIX ст. ён зазнаў пэўныя трансфармацыі: назіралася павышэнне патрабаванняў да камфартабельнасці ўмоў пражывання ў маёнтку; узрастала значэнне фактару блізкасці сухапутных камунікацый (у першую чаргу наяўнасці чыгуначных ліній) і адміністрацыйных цэнтраў. Памешчык выбіраў месца для сваёй рэзідэнцыі з мэтай атрымання найбольшага прэстыжу і доступу да дэфіцытных рэсурсаў – матэрыяльных або сімвалічных. Выбар месца мог адрозніваццa таксама ў залежнасці ад тыпу функцыянальнай прыналежнасці сядзібы [1, с. 102; 2, с. 186–187; 3, с. 26–27; 7, с. 281; 30].

2. Маёнтак забяспечваў рэалізацыю матэрыяльна-вытворчай, гаспадарча-бытавой, сацыялізацыйна-выхаваўчай, рэкрэацыйнай і статусна-рэпрэзентатыўнай функцый у сістэме жыццезабеспячэння і ўзнаўлення дваранскай сям'і. У адпаведнасці з патрэбай рэалізацыі вышэйназваных функцый на тэрыторыі дваранскай сядзібы вылучаліся наступныя зоны: вытворчая, гаспадарчая, жылая, рэкрэацыйная і парадная. Іх суадносіны ў агульнай прасторы маёнтка залежалі ад фінансавых магчымасцей памешчыка і тыпу функцыянальна-прасторавага заніравання сядзібы. Можна вызначыць два тыпы заніравання, кожны з якіх у сваю чаргу ўключаў шэраг пераходных падтыпаў. Тып «рэзідэнцыя» характарызаваўся дамінаваннем статусна-рэпрэзентатыўнай функцыі і наяўнасцю развітых параднай і рэкрэацыйнай зон, тып «фальварак» – матэрыяльна-вытворчай спецыялізацыяй тэрыторыі пры другасным значэнні статусна-рэпрэзентатыўнай і рэкрэацыйнай функцый. Пры наяўнасці адзначаных адрозненняў абодва тыпы ў роўнай ступені эфектыўна забяспечвалі рэалізацыю гаспадарча-бытавой, экзістэнцыйнай і сацыялізацыйна-выхаваўчай функцый. Пад уплывам заходніх, буржуазных па свайму генезісу, уяўленняў аб прыватным жыцці, а таксама агульнай маргіналізацыі шляхецкай культуры, значэнне рэпрэзентатыўнай функцыі рэзідэнцый паступова змяншалася.

Сярэдні і буйны маёнтак уяўляў сабой род сельскай агламерацыі, у склад якой уваходзілі рэзідэнцыя памешчыка, адзін або некалькі фальваркаў, вёсак, мястэчак. Дробнашляхецкія засценкі і ваколіцы ўтваралі знешняе атачэнне дваранскага маёнтка. Фізічная і сацыякультурная прастора маёнтка мела трохчасткавую структуру, дзе вылучаліся цэнтр (памешчыцкая сям'я і дворскія), перыферыя (сялянства), а таксама маргіналія, якую складалі прылягаючыя тэрыторыі з дробнашляхецкім насельніцтвам. Цэнтр у сваю чаргу меў таксама складаную структуру, кожны элемент якой выконваў сваю функцыю: адміністрацыйная функцыя забяспечвалася панскай рэзідэнцыяй, гаспадарча-прамысловая – фальваркам; гандлёвая – мястэчкам. Адміністрацыйны і гандлёвы цэнтры маглі супадаць, калі рэзідэнцыя памешчыка пераносілася ў мястэчка. Перыферыяй маёнтка выступала вёска, маргіналіяй – дробнашляхецкія засценкі і ваколіцы. Дробны маёнтак утвараў як правіла бінарную сістэму «фальварак/цэнтр – вёска/перыферыя». Такім чынам, у структуры тэрыторыі маёнтка, дзе вызначаліся бінарныя

суадносіны «верху» і «нізу», «цэнтра» і «перыферыі», адлюстроўвалася і падтрымлівалася сацыяльная іерархія. Самі маёнткі выступалі перыферыяй адносна гарадоў, найперш губернскіх. Хаця ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. буйныя маёнткі па сваіх эканамічных, дэмаграфічных і сацыяльна-культурных магчымасцях не саступалі павятовым цэнтрам, адміністрацыйны рэсурс апошніх, а таксама развіццё чыгуначнай сеткі паступова надавалі гарадам перавагу, якая да канца XIX ст. ператварыла «панскі маёнтак» у перыферыю сацыяльна-эканамічнага жыцця краю. У гарадах развівалася антаганістычная ў дачыненні арыстакратычных каштоўнасцей мяшчанская культура, меліся альтэрнатыўныя каналы знешніх культурных уплываў. Мясцовым польскамоўным памешчыкам удалося ўмацаваць этнакультурную ідэнтычнасць і ўнутрысаслоўную кансалідацыю, аднак памешчыцкі маёнтак як гаспадарчая інстытуцыя ў другой палове XIX ст. эканамічна саступаў гораду, дзе дамінавала руская разначынная культура [2, с. 187–188; 9, с. 430–431; 14, с. 463–464; 21; 24, с. 298; 41].

3. Дваранскі маёнтак як элемент традыцыйнай сістэмы рассялення на беларускіх землях узнік падчас існавання даіндустрыяльнага тыпу развіцця вытворчых сіл і панавання натуральнай гаспадаркі. Гістарычна ён фарміраваўся ва ўмовах дамінавання экстэнсіўных форм гаспадарання з улікам задачы забеспячэння максімальнай рэсурснай самадастатковасці. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі заставалася вядучай галіной эканамічнай дзейнасці памеснага дваранства на працягу вывучаемага перыяду.

Асаблівасці сістэмы вядзення на беларускіх землях памешчыцкай гаспадаркі (сукупнасць сацыяльна-эканамічных і арганізацыйных форм вытворчых адносін, прынцыпаў прыродакарыстання, тэхнічных сродкаў і тэхналагічных метадаў гаспадарання) былі закладзены ў часы існавання Рэчы Паспалітай і захаваліся ў сваіх асноўных рысах на землях Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Сучаснікамі дадзеная сістэма апазнавалася пад назвамі «польскі маёнтак» або «польскае землеўладанне». Вобласць выкарыстання тэрміна «польскі маёнтак» не абмяжоўвалася абазначэннем зямельна-маёмасных адносін або гаспадарчых практык дваран-католікаў, хаця апошнія ўтваралі ядро дадзенай сістэмы ў сілу таго, што ў агульным складзе мясцовых памешчыкаў рымакатолікі з’яўляліся большасцю. Да сферы функцыянавання «польскага маёнтка» ў краі адносіліся таксама землі значнай часткі праваслаўных памешчыкаў, у тым ліку дваран з велікарускіх губерняў, якія карысталіся паслугамі афіцыялістаў (служачых – камісараў, аканомаў і інш.) з тутэйшай шляхты і пасрэднікаў-«фактараў» і такім чынам траплялі ў абсяг мясцовых гаспадарчых традыцый.

На працягу XIX ст. у памешчыцкай гаспадарцы на беларускіх землях пераважала трохпольная сістэма. Шматпольны севазварот практыкаваўся пераважна ў магнацкіх гаспадарках. Найчасцей гэта былі выпадкі арганізацыі чатырохпольнай сістэмы з увядзеннем у севазварот бульбы і кармавых траў. Стымулам

для пераходу на шматпольную сістэму ў сярэдніх па заможнасці землеўладальнікаў з'яўляўся, як правіла, недахоп ворных зямель. Травасеянне было распаўсюджана ў памешчыцкіх маёнтках як з плодапераменным, так і палепшаным трохпольным севазваротамі. Пераважна гэта былі вялікія гаспадаркі, якія вырошчвалі мерыносаў ці замежныя пароды буйной рагатай жывёлы, і ў парэформенны перыяд інтэнсіўныя формы гаспадарання практыкаваліся адзінкамі.

У структуры пасеваў у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях пры пануючай трохпольнай сістэме севазвароту вылучалася «шэсць галоўных хлябоў»: жыта, авёс, ячмень, грэчка, бульба і пшаніца. На Магілёўшчыне і Віцебшчыне на працягу XIX ст. пры перавазе таксама трохпольнай сістэмы севазвароту каля паловы ўсіх палёў засявалася азімым жытам (менш – яравым). Пшаніца (пераважна яравая) вырошчвалася ў меншай колькасці. Шырока распаўсюджанай культурай з'яўлялася грэчка, якая займала ў асобных рэгіёнах другое месца пасля жыта. Наступнымі па значэнні культурамі былі яравыя авёс і ячмень, лён і каноплі. Паступова пашырылася практыка вырошчвання бульбы як палявой культуры, што спрыяла павышэнню рэнтабельнасці вінакурэння, дазваляла павялічыць пагалоўе свойскай жывёлы і паляпшала становішча з харчаваннем сялянства. Спробы памешчыкаў пашырыць вырошчванне цукровых буракоў з мэтай наладзіць вытворчасць цукру былі меней удалымі.

Агародніцтва не мела прамысловага значэння ў памешчыцкіх гаспадарках. Прагрэсіўныя агратэхнічныя веды рэдка прымяняліся на агародных палетках. Агародная гаспадарка ўладкоўвалася звычайна паблізу памешчыцкіх сядзіб і знаходзілася пад апекай жанчын. Разам з агароднінай вырошчваліся таксама вострыя прыправы, водарныя і лекавыя расліны, якія ўтваралі так званы «аптэкарскі» агарод.

Памешчыкам-уласнікам лясных участкаў не хапала ведаў аб вядзенні лясной гаспадаркі, клопат аб якой часта зводзіўся да аховы лесу ад крадзяжоў драўніны і пажараў. Недастатковымі былі захады па ўзнаўленню лясных рэсурсаў, што прыводзіла да вынішчэння каштоўных лясных угоддзяў у прылягаючых да сплаўных рэк мясцовасцях.

Патрэба атрымання якаснага ўгнаення з'яўлялася адной з галоўных прычын развіцця ў фальварках жывёлагадоўлі і ўтрымання свойскай птушкі. Недастатковае развіццё травасеяння і недахоп яравога жыта былі стрымліваючымі фактарамі для развіцця жывёлагадоўлі. У лепшым становішчы аказваліся памешчыцкія гаспадаркі, якія займаліся вінакурэннем, – бражка (барда) з дадаткам сена і саломы шырока выкарыстоўвалася для адкорму свойскай жывёлы і птушкі [2, с. 31, 188−189; 6, с. 92–93; 11, с. 304–305; 20; 22; 27, с. 477; 37; 42; 45].

4. Ва ўмовах адаптацыі грамадства і непасрэдна самой дваранскай памешчыцкай групы да працэсаў мадэрнізацыі аб'ектыўна запатрабаванымі з'яўляліся наступныя сацыякультурныя функцыі сацыяльнай эліты: інавацыйная, кіруючая, кансалідуючая. Інавацыйная функцыя эліты прадугледжвае адбор, засваенне і актуалізацыю ў грамадстве новых перспектыўных сацыяльна-культурных

узораў, норм, каштоўнасцей і тэхналогій; кіруючая функцыя – прыняцце рашэнняў, арганізацыю і кантроль; кансалідуючая – забеспячэнне працэсу павышэння сацыяльнай салідарнасці ў грамадстве. Пералічаныя функцыі рэалізаваліся ў значнай ступені ў эканамічнай дзейнасці, поспех або няўдачы на дадзеным поле з’яўляліся галоўным маркерам функцыянальнай адэкватнасці памеснага дваранства сваёй прывілеяванай пазіцыі ў сацыякультурнай сістэме беларускага этнасу. Памеснае дваранства, у першую чаргу буйныя землеўладальнікі, з’яўлялася галоўным правадніком знешніх уплываў і ініцыятарам інавацый, якія трансфармавалі традыцыйныя формы матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры этнасу.

Вылучаюцца дзве мадэлі гаспадарання ў дваранскім маёнтку Беларусі: «старасвецкая» (традыцыйная) і «рацыянальная» (інавацыйная, «узорная») гаспадарка. Традыцыйная мадэль узыходзіла да практыкі натуральнай гаспадаркі, калі памешчыцкая сям’я імкнулася максімальна забяспечваць свае вітальныя патрэбы за кошт уласнай вытворчасці, а прыбытак ад рэалізацыі сельскагаспадарчага прадукту ўкладваўся ў набыццё прадметаў статуснага спажывання. Інавацыйная мадэль прадугледжвала стварэнне высокаадаптыўнай таварнай гаспадаркі з апорай на рэкамендацыі аграрнай навукі. Ідэал рацыянальнай гаспадаркі засноўваўся на дакладным выкананні і кантролю разнастайных тэхналагічных паказчыкаў, новым уяўленні аб карысці і спажыўнасці сельскагаспадарчага прадукту, гігіене.

Рацыянальныя падыходы аднак не распаўсюджваліся на вобласць працоўных адносін. У многіх схемах разліку памешчыкамі за сялянскую працу алкаголь служыў сурагатам грошай і часта выступаў як сродак матывацыі сялян да працы. Стымуляванне росту спажывання алкаголю сярод сялян і дробнай шляхты ў многіх памешчыцкіх гаспадарках рабілася абавязковай умовай паспяховага функцыянавання маёнтка: гарантаваўся збыт гарэлкі з памешчыцкіх вінакурняў, павялічвалася прывабнасць арэнды корчмаў; сяляне рабіліся больш залежнымі і лаяльнымі да ўлады пана.

Вынік пры рэалізацыі той або іншай мадэлі ў бліжэйшай і сярэднетэрміновай перспектыве не з’яўляўся прадвызначаным. У некаторых выпадках спробы мадэрнізацыі маглі прыводзіць памешчыкаў да разарэння. І наадварот, экстэнсіўныя стратэгіі развіцця пры наяўнасці дастатковых рэсурсаў (напрыклад, лясных угоддзяў) дазвалялі землеўладальнікам на працягу пэўнага часу атрымліваць высокі прыбытак.

Для прадстаўнікоў памеснага дваранства Беларусі эканамічная дзейнасць з’яўлялася не толькі сродкам задавальнення матэрыяльных патрэб, але і спосабам самарэалізацыі – выяўленнем уласных ведаў, уменняў, здольнасцей; формай дэманстрацыі палітычных, філасофскіх, эстэтычных прынцыпаў, а таксама спробай стварэння ідэальнай мадэлі быцця. Гаспадарчая дзейнасць памешчыкаў, такім чынам, была абумоўлена не толькі рацыянальнымі эканамічнымі разлікамі, але і саслоўнымі стэрэатыпамі, уяўленнямі сацыяльнага прэстыжу, каштоўнаснымі дэтэрмінантамі.

Так, дэманстратыўнае (статуснае) спажыванне, якое часта пераасэнсоўвалася ў тэрмінах «марнатраўства» і «мантачання», пры ілюзіі сваёй нерацыянальнасці з'яўлялася часткай эканамічных і палітычных стратэгій захавання дамінуючага становішча памешчыкаў-арыстакратаў у грамадстве. Прадстаўнікі колаў сярэдніх і дробных землеўладальнікаў вымушаны былі прытрымлівацца статуснага спажывання, аднак у іх выпадку рэалізацыя дадзенага стылю эканамічных паводзін з'яўлялася абумоўленай патрэбай ашчаднасці або крэдыту. Выдаткі на рэпрэзентацыю дваранскай культурнай і палітычнай прысутнасці ў краі клаліся цяжарам на беларускае сялянства, у адносінах якога большасць прадстаўнікоў мясцовага памеснага дваранства не мела пачуцця этнакультурнай і канфесійнай салідарнасці [2, с. 189−191; 4, с. 5; 5, с. 59–60; 6, с. 90–92; 12, с. 367; 13, с. 135–136; 18; 19, с. 79; 23, с. 273–274; 25, с. 378–379; 26, с. 106–107; 36; 38; 40; 44; 48; 50; 51; 52].

5. Супольнасць панскага двара мела выразную іерархічную структуру, на вяршыні якой знаходзіўся гаспадар маёнтка і яго сям'я. Памешчыкі з'яўляліся не толькі прыкладам для ўласных дзяцей, але выконвалі і больш шырокую патрыярхальную місію ў сваім сацыяльным атачэнні.

Крытэрыямі стратыфікацыі на памешчыцкім двары былі саслоўнае паходжанне, маёмаснае становішча, узроставы і адукацыйны цэнз, прафесійная прыналежнасць. Паводле саслоўнага паходжання вылучаліся дзве буйныя групы: прыгоннае сялянства (чэлядзь) і шляхта (пасэсары, рэзідэнты, афіцыялісты). Узроставы падзел таксама вызначаў дзве выразныя супольнасці: тых, хто праходзіў навіцыят («хлопцаў») і сталых служачых. Вертыкаль кіравання падзяляла персанал на выканаўцаў («дворскія», якія дзяліліся ў сваю чаргу на «хлопцаў» і «пакаёвых», «рэспектовых» і «аплатных») і адміністратараў («дваран»). Суаднясенне з пэўнай дворскай стратай азначала доступ да дакладна вызначанага аб'ёму матэрыяльных даброт (умоў харчавання і пражывання, наяўнасці абслугі, колькасці аплаты). Аб займаемай пазіцыі ў дворскай супольнасці сведчыла форма (барва), якую насіў служачы. Кожнай страце дворскіх было вызначана асобнае месца на прасторы двара для пражывання, харчавання, утрымання коней.

Унутрыгрупавая дынаміка вызначалася на памешчыцкім двары ў першую чаргу магчымасцю рабіць прафесійную кар'еру. Дворскую службу шляхціцы пачыналі ў юнацтве. Першыя тры гады службы на панскім двары былі для шляхецкай моладзі часам інтэнсіўнага засваення норм паводзін, правіл этыкету, гігіенічных навыкаў, патрабаванняў дысцыпліны. Маладыя людзі спачатку выконвалі абавязкі «хлопцаў» (венгрыкаў, турчат, карлікаў, пажоў, казачкоў). Набываючы вопыт, моладзь пераходзіла на пасады «пакаёвых»: дзверных, варотных, казакаў, пахолкаў, гайдукоў, лёкаяў (ці камер-лёкаяў), палацёраў. Межы сацыяльных страт не з'яўляліся непераадольнымі нават для прадстаўнікоў непрывілеяванага саслоўя. Кар'ера пры панскім двары садзейнічала агульнаму павышэнню статусу асобы ў соцыуме. Паспяховасць выкананне службовых абавязкаў,

назапашванне вопыту, ведаў, удасканаленне ўменняў былі ўмовай прасоўвання па іерархічнай лесвіцы. На шэрагу нізавых пасад існаваў дакладна вызначаны тэрмін іх выканання, пасля чаго прадугледжвалася павышэнне. Універсальным фактарам, які касаваў усе абмежаванні, з'яўлялася воля гаспадара маёнтка, – ступень блізкасці да пана вызначала месца асобы ва ўнутрыдворскай іерархіі.

У аснове стратэгій паводзін мясцовых землеўладальнікаў ляжалі ідэалагема «шляхецкай роўнасці» і правілы «братэрскай» (унутрысаслоўнай) узаемадапамогі. «Таварыская» мадэль паводзін была разлічаная на прадстаўнікоў свайго сацыяльна-культурнага асяродка і ўтрымлівала рысы ўнутрыгрупавога альтруізму. «Таварыскі чалавек» як прадукт эпохі Асветніцтва меў агульны сацыяльны генезіс з аналагічнымі ролямі еўрапейскай эліты: «светским человеком» у рускай культуры, *a socialite* – у англічан, *le mondain* – у французаў. Дадзеная ідэалагема знаходзілася ў адным сэнсавым полі з наступнымі стэрэатыпамі, каштоўнасцямі і ідэаламі: уяўленнем аб выключнай вартасці палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай і «залатых шляхецкіх вольнасцях», прыматам радавітасці пры ацэнцы маральных і дзелавых якасцей асобы, культам сям'і, роду і «радавога гнязда» [2, с. 192−193; 29, с. 306; 33, с. 141; 53].

6. На працягу XIX – у пачатку XX ст. з папулярызацыяй асветніцкіх, а пазней пазітывісцкіх ідэй адукацыя і выхаванне пачалі ўспрымацца ў айчынным дваранскім памешчыцкім асяроддзі як важныя грамадскія інстытуты. Пры наяўнасці падобнага кансэнсусу адначасова назіралася шырокая разнастайнасць педагагічных метадаў і стратэгій, якія маглі ўступаць паміж сабой у канфлікт нават у межах адной сям'і. У агульным выхаваўчым працэсе суіснавалі элементы навуковых канцэпцый, рэлігійных патрабаванняў, «старасвецкіх» узораў паводзін і традыцыйных метадаў народнай педагогікі.

Важнае значэнне надавалася хатняй адукацыі. Сярод яе найбольш істотных задач вылучалася падрыхтоўка да паступлення ў публічныя школы або гімназіі, а таксама больш глыбокае, чым гэта забяспечвалася школьнай праграмай, засваенне замежных моў і дысцыплін эстэтычнага цыклу. У сем'ях памешчыкаў-католікаў дадавалася яшчэ адна задача – выхаванне дзяцей у «польскім нацыянальным духу», а таксама нейтралізацыя негатыўнага з пункту гледжання дадзенай сацыяльнай групы культурнага ўплыву афіцыйнай школы на дзяцей. Дзеля дасягнення дадзенай мэты ў межах хатняй падрыхтоўкі дзецям дадаткова выкладалі польскую мову, літаратуру і гісторыю.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай каталіцкая памешчыцкая сям'я, якая мела значныя эканамічныя і інтэлектуальныя рэсурсы, пачала трактавацца ідэолагамі польскай нацыянальна-вызваленчай барацьбы як адна з галоўных інстытуцый, адказных за развіццё польскай нацыянальнай культуры, патрыятычнай свядомасці і захаванне каталіцкай веры на землях Беларусі, дзе пераважала іншаэтнічнае і іншаканфесійнае сялянскае і мяшчанскае асяроддзе. Падобная місія выма-

гала выдаткавання істотных матэрыяльных рэсурсаў і грамадскіх ахвяр, а таксама негатыўна адбівалася на эканамічным становішчы краю і беларускага сялянства, значна стрымлівала развіццё беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці. Дадзеная місія павышала значэнне дваранскай памешчыцкай сям'і ў полі палітычнага, этнакультурнага і канфесійнага супрацьстаяння на беларускіх землях у якасці галоўнага сацыяльнага інстытута, адказнага за сацыяльнае ўзнаўленне польскай палітычнай эліты. Апошняе ставіла мясцовых дваран-памешчыкаў у цэнтр вострых сацыяльна-палітычных і этнаканфесійных канфліктаў, а само існаванне дадзенай элітнай групы рабілася крыніцай геапалітычных рызык для Беларусі і беларускага этнасу.

Маёнтак усведамляўся дваранамі як «маленькая радзіма», – тут праходзіла значная частка жыцця памешчыка і членаў яго сям'і. Сам тэрмін «паместнае дваранства» ўказвае на значнасць гэтага асяроддзевага фактару для знешняй ідэнтыфікацыі і ўнутранага самавызначэння дадзенай саслоўнай групы. У маёнтках фарміравалася выхаваўчае асяроддзе, у якім маладое пакаленне дваран набывала першыя веды пра край і род. Былі выпрацаваны стратэгіі мемарыялізацыі радавой гісторыі паместнага дваранства: збіраліся радавыя легенды, вывучаўся радавод, фарміраваўся сямейны архіў, збіраліся рэчы «з гісторыяй» і ствараліся хатнія музейныя экспазіцыі, уладкоўваліся мемарыяльныя аб'екты ландшафту (мемарыяльныя дрэвы, камяні), будаваліся мемарыяльныя аб'екты на тэрыторыі сядзібы (памятныя дошкі, стэлы, абеліскі, магілкі), рабіліся памятныя надпісы ў інтэр'еры памешчыцкага дому, фундаваліся храмы. Разам з тым заснаваная на дакументальных крыніцах гісторыя сям'і часта адсутнічала і радавая памяць насіла дыскрэтны міфічны характар. Гэта здаралася найчасцей, калі род прыходзіў да заняпаду, страчваліся радавыя зямельныя ўладанні, а разам – і прастора мемарыялізацыі і захавання сямейнай гісторыі. І, наадварот, калі асобныя прадстаўнікі роду дамагаліся поспеху, яны былі зацікаўленыя ў выбудоўванні персанальнай рэдакцыі радавой гісторыі і адасаблення ад агульных са сваімі меней паспяховымі родзічамі вытокаў.

Асаблівасцю сямейнага выхавання і хатняй адукацыі ва ўмовах дваранскага маёнтка з'яўляўся ўдзел у выхаваўчым працэсе шырокага кола асоб, якія належалі да розных сацыяльных груп. Захоўвалася магчымасць уплыву элементаў народнай педагагічнай традыцыі на выхаванне дзяцей памешчыкаў. У сваю чаргу, землеўладальнікі выконвалі педагагічныя функцыі ў дачыненні як да ўласных дзяцей, так і да ўсяго насельніцтва маёнтка, што было абумоўлена самім характарам патрыярхальных адносін. Таму можна гаварыць аб наяўнасці спецыфічнага адукацыйнага і сацыялізуючага асяроддзя маёнтка, у якім адбываўся працэс узнаўлення не толькі культуры дваранскага памешчыцкага саслоўя, але і яго іншасаслоўнага сацыяльнага атачэння [2, с. 191–192; 8, с. 242; 10, с. 135; 16; 17; 28, с. 173; 31, с. 233; 32, с. 237; 34, с. 12–13; 39; 43; 46; 47; 49].

7. Традыцыя гасціннасці ў класічным («сармацкім») варыянце вымагала ад памешчыка гарантавання нават незнаёмаму вандроўніку магчымасці начлегу, сталавання, размяшчэння яго слуг і коней. Пакліканы госць мог прыводзіць з сабой некалькі родных і сяброў. Як правіла, гасцяванне зацягвалася да трох дзён. У некаторых памешчыцкіх сем'ях лічылася ганьбай садзіцца за абедзенны стол без госця. Калі кандыдат на гэтае званне адсутнічаў, запрашалі мясцовага ксяндза. Падтрымліванне традыцыі ў падобным выглядзе вымагала ад памешчыцкай гаспадаркі вялікіх і не заўжды палічаных выдаткаў. Аднак адыход ад традыцыі, спробы эканоміць на гасціннасці асуджаліся.

У поўным аб'ёме традыцыі гасціннасці выконваліся толькі ў выпадку асоб, якія займалі роўнае або больш высокае па сацыяльнаму статусу становішча ў дачыненні прадстаўнікоў прымаючага боку. Рэдкім выключэннем з'яўляліся пэўныя святы і ўрачыстасці (напрыклад, зажынкі, дажынкі, імяніны пана), калі прадстаўнікі ніжэйшага саслоўя маглі разлічваць на панскі пачастунак.

Традыцыі гасціннасці і, у прыватнасці, застольны рытуал у культуры паместнага дваранства служылі спосабам прэзентацыі сацыяльнага статусу (заможнасці, сувязей, радавітасці), а таксама падтрыманню ўнутрыгрупавой статуснаролевай дыферэнцыяцыі. Адначасова гэта быў інструмент палітычнай мабілізацыі прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя і спосаб падтрымання высокай саслоўнай салідарнасці. Гасціннасць служыла мэтам фарміравання грамадскай думкі (стымулявання кола палітычных прыхільнікаў) і была ўключана ў інструментарый рэалізацыі матрыманіяльных стратэгій. Пералічаныя стратэгіі падразумявалі пэўны тып сацыяльных камунікацый, які вымагаў ад прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя выканання ролі «таварыскага чалавека».

Практыкі гасціннасці не падпадалі ні пад адміністрацыйны, ні пад ідэалагічны кантроль з боку дзяржаўных ці царкоўных органаў. Падобная камунікатыўная работа ператварала мясцовых дваран-землеўладальнікаў у найбольш кансалідаваную сацыяльную групу ў гетэрагенным па канфесіянальным і этнічным складзе грамадстве [2, с. 193−194; 15, с. 93–94; 35].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

*У навуковай сферы* вынікі дысертацыйнага даследавання, яго высновы і палажэнні могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы комплексных навуковых работ у галіне гістарычнай этналогіі і гісторыі як Беларусі, так і ўсходнеславянскага рэгіёна. *У сферы адукацыі* матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы вучэбна-метадычнага суправаджэння дысцыплін, такіх як этналогія, гісторыя беларускай дзяржаўнасці, культуралогія ў вышэйшых адукацыйных установах Рэспублікі Беларусь. Вывады і асноўныя палажэнні работы выкарыстоўваюцца аўтарам пры выкладанні вучэбных дысцыплін «Культура землеўладальніцкіх рэзідэнцый у Беларусі (к. XVIII – п. XX ст.)», «Краязнаўства і этналогія Беларусі», «Гісторыя культуры Беларусі», «Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі ў XIX ст.» на гуманітарным

факультэце УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», а таксама кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» (акты ўкаранення прыкладаюцца). *У сферы патрыятычнага выхавання* вынікі і вывады дысертацыі будуць спрыяць паглыбленню ў грамадстве разумення айчыннай культуры і заканамернасцей гісторыі Беларусі. *У сферы дзяржаўнага кіравання* вывучэнне генезісу сацыякультурных і эканамічных традыцый айчыннай эліты дазволіць праводзіць больш якасны аналіз сучасных сацыяльна-палітычных працэсаў і геапалітычных рызык. Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца *ў сферы развіцця турызму*, пры правядзенні тэматычных экскурсій, падрыхтоўцы канцэпцый рэвіталізацыі дваранскіх сядзіб, развіцця нацыянальных брэндаў у галіне культуры.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

## Манаграфіі

1 Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі : 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 168 с.

2 Шыдлоўскі, С. А. Памеснае дваранства Беларусі: канец XVIII – пачатак XX ст.: этналагічнае даследаванне / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – 221 с.

## Раздзел у калектыўнай манаграфіі

3 Чаквін, І. У. Генезіс, структура і функцыі сацыяльнай эліты / І. У. Чаквін, С. А. Шыдлоўскі // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. – Т. 1.: Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 9–41.

## Артыкулы ў рэцэнзаваных навуковых часопісах

4 Шыдлоўскі, С. А. Сістэма рацыянальнага гаспадарання ў рабоце Ганны Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня» / С. А. Шыдлоўскі // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2013. – № 9. – С. 2–6.

5 Шидловский, С. О. Эдуард Томаш Массальский о стратегиях эксплуатации белорусского крепостного крестьянства / С. О. Шидловский // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2014. – № 1. – С. 57–60.

6 Шидловский, С. О. Кризис хозяйственных практик и традиционных форм виталитивной культуры поместного дворянства Беларуси в отражении романа Э. Т. Массальского «Пан Подстолич» / С. О. Шидловский // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2015. – № 9. – С. 90–94.

7 Шыдлоўскі, С. А. Памешчыцкі маёнтак у традыцыйнай сістэме рассялення Беларусі: канец XVIII – пачатак XX ст. / С. А. Шыдлоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2017. – Вып. 23. – С. 277–283.

8 Шыдлоўскі, С. А. Педагагічныя традыцыі памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2018. – Вып. 25. – С. 238–243.

9 Шыдлоўскі С. А. Рачныя камунікацыі ў традыцыйнай транспартнай сістэме Беларусі XIX ст. / С. А. Шыдлоўскі // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Ист. и психол.-педагог. науки. – 2018. – Вып. 18. – Ч. 1. – С. 426–432.

10 Шыдлоўскі, С. А. Тэарэтычныя падставы выхавання ў дваранскіх памешчыцкіх сем'ях Беларусі (к. XVIII – п. XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Ист. и психол.-педагог. науки. – 2019. – Вып. 19. – Ч. 2. – С. 130–136.

11 Шыдлоўскі, С. А. Гандлёвыя практыкі памеснага дваранства Беларусі (к. XVIII − пач. XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Ист. и психол.-педагог. науки. – 2020. – Вып. 20. – Ч. 2. – С. 300–307.

12 Шыдлоўскі, С. А. Эканамічныя паводзіны памеснага дваранства Беларусі: дэманстратыўнае спажыванне і ашчаднасць (канец XVIII – пачатак XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2020. – Вып. 28. – С. 364–369.

13 Шыдлоўскі, С. А. Алкаголь у міжсаслоўных камунікацыях на беларускіх землях XIX – пачатку XX ст. / С. А. Шыдлоўскі // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Ист. и психол.-педагог. науки. – 2021. – Вып. 21. – Ч. 3. – С. 130–138.

14 Шыдлоўскі, С. А. Памеснае дваранства Беларусі: генезіс і развіццё саслоўнай групы (1772–1917) / С. А. Шыдлоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2021. – Вып. 29. – С. 461–468.

15 Шыдлоўскі, С. А. Традыцыі гасціннасці памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII − пачатак XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Изв. Нац. акад. наук Беларуси. Сер. гуман. наук. – 2022. – Т. 67. – № 1. – С. 88−96.

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац і часопісах**

16 Шыдлоўскі, С. А. Уласныя імёны ў кнізе Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», як крыніца рэканструкцыі этнічнай карціны свету прывілеяванага саслоўя беларускага Падзвіння ў першай палове XIX ст. / С. А. Шыдлоўскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20−21 лістап. 2008 г. / Пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 287−290.

17 Шыдлоўскі, С. А. Полацкі гістарычны наратыў на старонках часопісаў «Вестник Юго-Западной и Западной России» і «Вестник Западной России» К. Гаворскага / С. А. Шыдлоўскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 крас. 2011 г. У 2 ч. / Пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Ло бача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – С. 99–104.

18 Шыдлоўскі, С. А. Полацкія сюжэты ў «заходнерускай» версіі гісторыі Беларусі М. В. Каяловіча / С. А. Шыдлоўскі // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Полацк, 22–23 мая, 2012 г. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 214−217.

19 Шидловский, С. О. Из проектов И. С. Аксакова по социокультурному обустройству Северо-Западного края Российской империи / С. О. Шидловский // Славяноведение. – 2013. – № 5. – С. 78–85.

20 Шыдлоўскі, С. А. «Запіскі» В. М. Севергіна як крыніца па гісторыі і этнаграфіі Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый / С. А. Шыдлоўскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. II Міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 крас. 2014 г. У 2 ч. / Пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 265–268.

21 Шидловский, С. О. Игорь Всеволодович Чаквин: учёный, человек, учитель / С. О. Шидловский // Избранное: теоретические и историографические статьи по этногенезу, этническим и этнокультурным процессам, конфессиональной истории белорусов / И. В. Чаквин ; отв. ред.-сост. А. Вл. Гурко. – Минск : Беларус. навука, 2014. – С. 14–17.

22 Шидловский, С. О. Представления о личности помещика на витебско-смоленском пограничье / С. О. Шидловский // Личность в пространстве и времени : сб. науч. ст. V Междунар. науч.-практ. конф. / Под ред. Н. П. Сенченкова [и др.]. – Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2015. – Вып. 5. – С. 203−206.

23 Шидловский, С. О. Формы адаптации поместного дворянства Беларуси к социально-экономическим и культурным условиям жизни в Российской империи (первая половина XIX века) / С. О. Шидловский // Социально-психологические проблемы ментальности / менталитета : сб. науч. ст. XII Междунар. науч. конф. / Под ред. Н. П. Сенченкова [и др.]. – Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2016. – Вып. 12. – С. 272−276.

24 Шидловский, С. О. Экимань и экиманская усадьба: перспективы ревитализации в контексте этнокультурной традиции / С. О. Шидловский // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. III Міжнар. навук. канф., Полацк, 14−15 красав. 2016 г. У 2 ч. / Пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2016. – Ч. 1. – С. 296–301.

25 Шидловский, С. О. Рациональность в сельскохозяйственной практике белорусских помещиков XIX века / С. О. Шидловский // Когнитивные штудии: когнитивная парадигма в междисциплинарных исследований : материалы VII Междунар. междисципл. конф., Минск, (19−20 мая 2017 г. – Минск : БГПУ, 2017. – С. 375–381.

26 Шидловский, С. О. Социальные функции дворянства в отражении общественного мнения на белорусских землях в XIX веке / С. О. Шидловский // Социально-психологические проблемы ментальности / менталитета : сб. науч. ст. / Под ред. Н. П. Сенченкова [и др.]. – Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2017. – Вып. 13. – С. 106−109.

27 Шидловский, С. О. Инвентарная опись имения Экимания (1846–1848) как источник для изучения хозяйственной культуры дворянства Полотчины 40-х гг. XIX в. / С. О. Шидловский // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф., Полацк, 19−20 крас. 2018 г. / Пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2018. – 1 элек. аптыч дыск (CD-ROM). – С. 470–540.

28 Шыдлоўскі, С. А. Традыцыі мемарыялізацыі мінулага ў культуры памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя) / С. А. Шыдлоўскі // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. ст. ; редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2019. – Вып. 2. – С. 167–176.

29 Шыдлоўскі, С. А. Сацыяльныя практыкі ў асяроддзі дваран-памешчыкаў Беларусі Ў XIX стагоддзі : таварыскія ўзаемаадносіны [Электронны рэсурс] / С. А. Шыдлоўскі // VII Междунар. науч. конф., посвящ. 125-летию Л. С. Выготского, Гомель, 18–19 нояб. 2021 г. : сб. материалов ; редкол.: И. В. Сильченко (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2021. – С. 305−308. – Рэжым доступу: http://conference.gsu.by. – Дата доступу: 15.10.2022.

30 Шыдлоўскі, С. А. Этнагенез беларусаў і этнічная гісторыя нашай краіны / С. А. Шыдлоўскі // Наука и инновации. – 2021. – № 2. – С. 6−9.

31 Шидловский, С. О. «Miesięcznik Połocki» (1818−1820): у истоков формирования отечественной педагогической журналистики / С. О. Шидловский // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Пад агульн. рэд. А. І. Корсак (адк. рэд.), В. У. Чараўко, У. Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – С. 230−235.

32 Шидловский, С. О. Семейное воспитание и формирование исторического сознания в семьях дворян-помещиков Беларуси (конец XVIII – начало XX вв.) / С. О. Шидловский // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы. Исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. ст. – СПб.: Алетейя, 2022. – С. 223−242.

33 Шыдлоўскі, С. А. Традыцыі ўнутрысаслоўнай салідарнасці памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII – першая палова XIX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія : зб. навук. арт. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – Вып. 1. – С. 135−143.

**Вучэбна-метадычныя дапаможнікі**

34 Шидловский, С. О. Краеведение : учеб.-метод. комплекс для студ. специальности 1-89 01 01 «Туризм и гостеприимство» / С. О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – 172 с.

**Тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый**

35 Шыдлоўскі, С. А. Матрыманіяльныя стратэгіі ў сістэме стратэгій адаптацыі беларускага прывілеяванага грамадства першай паловы XIX стагоддзя / С. А. Шыдлоўскі // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : сб. материалов IV междунар. науч. конф. – Новополоцк : ПГУ, 2010. – С. 117−118.

36 Шыдлоўскі, С. А. Захаванне і пераапрацоўка малочнай прадукцыі ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі (XIX – пачатак XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Актуальные проблемы в изучении и преподавании общественно-гуманитарных наук (дисциплин) : сб. науч. раб. III Междунар. науч. конф., Витебск, 30 нояб. – 1 дек. 2012 г. – Витебск : ВФ УО ФПБ «Международный университет МИТСО», 2012. – С. 18–19.

37 Шыдлоўскі, С. А. Падзеі Айчыннай вайны 1812 года на старонках мемуараў Э. Т. Масальскага / С. А. Шыдлоўскі // Отечественная война 1812 года

в исторических судьбах и культурном наследии народов России и Европы : сб. науч. ст. Междунар. науч.-практ. конф., посвящю 200-летию победы России в Отечественной войне 1812 года, Витебск, 28–29 нояб. 2012 г. – Витебск : Междунар. ун-т МИТСО, 2012. – С. 202–204.

38 Шыдлоўскі, С. А. Гендарны падзел працы ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў XX ст. (на падставе работы Г. Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня» і Л. Цверчакевіч «Курс гарадской і вясковай гаспадаркі для жанчын») / С. А. Шыдлоўскі // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : сб. материалов V междунар. науч. конф., Новополоцк, 31 окт. – 1 нояб. 2013 г. – Новополоцк : ПГУ, 2013. – С. 110–111.

39 Шидловский, С. О. Дворянское поместье в системе социализации привилегированного сословия Беларуси / С. О. Шидловский // Психосоциальная адаптация в трансформирующемся обществе: социализация субъекта на разных этапах онтогенеза [Электронный ресурс] : материалы IV Междунар. науч. конф., Минск, 21–22 мая 2015 г. / И. А. Фурманов (отв. ред.) [и др.]. – Электрон. дан. (22,7 Мб). – Минск : Изд. центр БГУ, 2015. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – С. 502–504.

40 Шыдлоўскі, С. А. Практыкі аптымізацыі выдаткаў і рацыяналізацыі прыгоннай гаспадаркі на беларускіх землях у дарэформленны перыяд / С. А. Шыдлоўскі // Управление в социальных и экономических системах : материалы XXIV междунар. науч.-практ. конф., Минск, 14 мая 2015 г. – Минск : Минс. ун-т управления, 2015. – С. 237–239.

41 Шыдлоўскі, С. А. Шляхецкі двор на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст.: традыцыі будаўніцтва / С. А. Шыдлоўскі // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. ст. респ. науч.-практ. семенара, Новополоцк, 8–9 окт. 2015 г. – Новополоцк : ПГУ, 2015. – С. 108–110.

42 Шидловский, С. О. Экологический аспект критики традиционных практик лесопользования поместного дворянства Беларуси в романе Э. Массальского «Пан Подстолич» / С. О. Шидловский // XI Конгресс антропологов и этнологов России: сб. материалов / Отв. ред.: В. А. Тишков, А. В. Головнёв. – М. ; Екатеринбург : ИЭА РАН, ИИиА УрО РАН, 2015. – С. 176.

43 Шыдлоўскі, С. А. Дваранскі маёнтак Беларусі ў к. XVIII – XX ст. як сфера ўзнаўлення шляхецкай супольнасці / С. А. Шыдлоўскі // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : материалы VI междунар. науч. конф., Новополоцк, 27–28 окт. 2016 г. – Новополоцк : ПГУ, 2016. – С. 13–14.

44 Шидловский, С. О. Отношение к экспертному знанию в среде белорусского поместного дворянства (конец XVIII – начало XX вв.) / С. О. Шидловский // Седьмая междунар. конф. по когнитивной науке : тез. докл., Светлогорск, 20–24 июня 2016 г. – М.: Ин-т психологии РАН, 2016. – С. 637–638.

45 Шидловский, С. О. Региональные различия в структуре посевных площадей помещичьей запашки в Беларуси XIX – начала XX века / С. О. Шидловский //

Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры, Мінск, 5–6 мая 2016 г. / А. І. Лакотка (гал. рэд.). – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – С. 818.

46 Шидловский, С. О. Бытовая и портретная живопись как источник изучения истории повседневности дворянства Белорусского Подвинья конца XVIII – начала XX века / С. О. Шидловский, И. В. Голубева // Микроистория и история повседневности: новый взгляд на историческое и культурное наследие : Междунар. науч. конф., Браслав, 6 окт. 2016 г. – Минск : Белнаучкнига, 2017. – С. 50–52.

47 Шидловский, С. О. Путешествия и спорт как формы рекреационной и коммуникационной деятельности поместного дворянства Беларуси XIX – начала XX вв. / С. О. Шидловский // Проблемы и перспективы развития физической культуры, спорта и туризма в Республике Беларусь : материалы Респ. науч.-практ. семинара, Полоцк, 24 марта 2017 г. – Новополоцк : ПГУ, 2017. – С. 33–35.

48 Шыдлоўскі, С. А. Беларускі кірмаш XIX ст. як гандлёвая імпрэза і месца міжсаслоўнай камунікацыі / С. А. Шыдлоўскі // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. У 2 ч. – Гродна : ГрДУ, 2019. – Ч. 2. – С. 249−251.

49 Шидловский, С. О. Представления о возрастной периодизации детства в белорусских дворянских семьях / С. О. Шидловский // Дев'яті Сіверянські соціально-психологічні читання : Матеріали Міжнар. наук. конф., Чернігів, 30 лист. 2018 р. / За наук. ред. О. Ю. Дроздова, І. І. Шлімакової. – Чернігів : НУ «ЧК» ім. Т. Г. Шевченка, 2019. – С. 372–374.

50 Шыдлоўскі, С. А. Гандаль лесам і лесаматэрыяламі ў сістэме эканамічных практык памеснага дваранства Беларусі ў XIX ст. / С. А. Шыдлоўскі // Копытенские чтения − IV : сб. ст. междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 19−20 марта 2020 г. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2020. – С. 80–81.

51 Шыдлоўскі, С. А. Арганізацыя працы ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў XIX – пачатку XX стагоддзя: матывацыя і кантроль / С. А. Шыдлоўскі // Романовские чтения – 15 : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 26–27 нояб. 2020 г. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2021. – С. 37–38.

52 Шыдлоўскі, С. А. Развіццё вінакурнай і піваварнай вытворчасці ў Магілёўскай губерні (паводле звестак К. Ц. Анікіевіча і А. С. Дамбавецкага) / С. А. Шыдлоўскі // Жизнь и творческое наследие А. С. Дембовецкого: к 180-летию со дня рождения : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 13 марта 2020 г. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – С. 97−99.

53 Шыдлоўскі, С. А. Міжсаслоўныя камунікацыі ў дваранскім маёнтку (к. XVIII – 1-ая пал. XIX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Новые коммуникативные технологии и современное белорусское общество : электрон. сб. ст. II Междунар. науч. конф, Новополоцк, 22–23 апр. 2021 г. / Под общ. ред. С. О. Шидловского. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2022. – 1 электрон. опт. диск (CD-R). – С. 53−54.

## РЭЗЮМЭ

**Шыдлоўскі Сяргей Алегавіч**

### Памеснае дваранства Беларусі (канец XVIII − пачатак XX ст.): этналагічнае даследаванне

**Ключавыя словы:** памеснае дваранства, традыцыі рассялення і жыццезабеспячэння, эканамічныя паводзіны, рацыянальная гаспадарка, дэманстратыўнае спажыванне, механізмы сацыякультурнага ўзнаўлення, мемарыяльная культура, традыцыі гасціннасці, сацыяльныя камунікацыі, гістарычная этналогія

**Мэта даследавання:** комплексная характарыстыка працэсаў і механізмаў сацыякультурнага развіцця памеснага дваранства Беларусі як прывілеяванай групы беларускага этнасу ў канцы XVIII − пачатку XX ст.

**Метады даследавання:** этнаэкалагічны і этнолага-геаграфічны падыходы, прынцыпы структуралісцкага канструктывізму; структурна-функцыянальны, гісторыка-генетычны і параўнальна-гістарычны метады.

**Навуковая навізна даследавання:** упершыню ў айчыннай этналогіі сацыякультурнае развіццё памеснага дваранства Беларусі прааналізавана ў кантэксце працэсаў адаптацыі беларускага этнасу да мадэрнізацыйных зменаў канца XVIII − пачатку XX ст.; працэсы і механізмы адаптацыі разгледжаны ў сістэмнай сувязі з навакольным асяроддзем: прыродным і сацыяльным; выяўлены структурныя элементы супольнасці памешчыцкага двара; даследаваны стратэгіі мемарыялізацыі гісторыі роду і выхавання гістарычнай свядомасці ў асяроддзі памешчыцкай моладзі; ахарактарызавана кансалідуючая функцыя традыцый гасціннасці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** тэарэтычныя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы комплексных навуковых даследаванняў у галіне гістарычнай этналогіі і гісторыі Беларусі. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы вучэбна-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу па этналогіі, гісторыі беларускай дзяржаўнасці, культуралогіі ў вышэйшых адукацыйных установах Беларусі.

**Вобласць прымянення:** этналогія, гісторыя, культуралогія, краязнаўства, турызм.

## РЕЗЮМЕ


**Шидловский Сергей Олегович**

**Поместное дворянство Беларуси (конец XVIII − начало XX в.): этнологическое исследование**

**Ключевые слова:** поместное дворянство, традиции расселения и жизнеобеспечения, экономическое поведение, рациональное хозяйство, демонстративное потребление, механизмы социокультурного воспроизводства, мемориальная культура, традиции гостеприимства, социальные коммуникации, историческая этнология

**Цель исследования:** комплексная характеристика процессов и механизмов социокультурного развития поместного дворянства Беларуси как привилегированной группы белорусского этноса в конце XVIII – начале XX в.

**Методы исследования:** этноэкологический и этнолого-географический подходы; принципы структуралистского конструктивизма; структурно-функциональный, историко-генетический и сравнительно-исторический методы.

**Научная новизна исследования:** впервые в отечественной этнологии социокультурное развитие поместного дворянства Беларуси проанализировано в контексте процессов адаптации белорусского этноса к модернизационным изменениям конца XVIII − начала XX в.; процессы и механизмы адаптации рассмотрены в системной связи со средой: природной и социальной; выявлены структурные элементы сообщества помещичьего двора; исследованы стратегии мемориализации истории семьи и воспитания исторического сознания в среде помещичьей молодежи; описана консолидирующая функция традиций гостеприимства.

**Рекомендации по использованию:** теоретические положения диссертации могут быть использованы при подготовке комплексных научных исследований в области исторической этнологии и истории Беларуси. Материалы диссертационного исследования могут быть использованы при подготовке учебно-методического обеспечения образовательного процесса по этнологии, истории белорусской государственности, культурологии в высших учебных заведениях Беларуси.

**Область применения:** этнология, история, культурология, краеведение, туризм.

## SUMMARY

**Siarhei Shydlouski**

### The Belarusian Landed Gentry (late 18th − early 20th centuries): an ethnological study

**Key words:** Landed Gentry, settlement and life support system traditions, economic behavior, rational economy, conspicuous consumption, mechanisms of sociocultural reproduction, memorial culture, hospitality traditions, social communications, historical ethnology

**The goal of research** a comprehensive description of the processes and mechanisms of the socio-cultural development of the Belarusian Landed Gentry as a privileged group of the Belarusian ethnos in the late 18th − early 20th centuries.

**The methods of doing research** ethnoecological and ethnological-geographical approaches; principles of structuralist constructivism; structural-functional, historical-genetic and comparative-historical methods.

**Newness of research:** for the first time in Russian ethnology, the socio-cultural development of the local nobility of Belarus was analyzed in the context of the processes of adaptation of the Belarusian ethnos to the modernization changes of the late 18th − early 20th centuries; processes and mechanisms of adaptation are considered in a system connection with the environment: natural and social; the structural elements of the community of the landowner's court were revealed; Strategies for memorializing the history of the family and educating historical consciousness among landlord youth have been studied; the consolidating function of hospitality traditions is described.

**Recommendations on implementation:** the theoretical provisions of the dissertation can be used in the preparation of complex scientific research in the field of historical ethnology and history of Belarus. The materials of the dissertation research can be used in the preparation of educational and methodological support for the educational process in ethnology, the history of the Belarusian statehood, cultural studies in higher educational institutions of Belarus.

**Area of application:** ethnology, history, cultural studies, local history, tourism.

## ДЛЯ ЗАПІСАЎ

# ДЛЯ ЗАПІСАЎ

**ДЛЯ ЗАПІСАЎ**

*Навуковае выданне*

ШЫДЛОЎСКІ Сяргей Алегавіч

**ПАМЕСНАЕ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ**
**(КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТ.):**
**ЭТНАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ**

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія


Падпісана да друку 20.02.2023. Фармат 60x84 1/16. Бумага афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 3,14. Ул.-выд. арк. 2,79. Тыраж 60 экз. Заказ 040.

Выдавец і паліграфічнае выкананне –
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных вырабаў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 27.05.2004.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.